У ЛІТАРАТУРУ – ПРАЗ «ТАБУРЭТКУ»?

ЧЫРВОНКА

ЯК ІНЖЫНЕР-ЭЛЕКТРОНІК СТАЎ ПЕЧНІКОМ

ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 ЛЮТАГА 2019 г. ЧАЦВЕР № 35 (28902)

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Сяргей РУМАС, прэм'ер-міністр:**

*«Сярэдні заробак у Беларусі ў студзені склаў 982 рублі і, у прынцыпе, знаходзіцца ў рамках прагнозу ўрада. За 2018 год рэальныя грашовыя даходы насельніцтва прыраслі на 8 %, гэта ў 2,5 раза вышэй за прагнозны ўзровень. Рэальная заработная плата вырасла на 11,6 %, у тым ліку ў бюджэтнай сферы — амаль на 14 %. Сёлета ўрад будзе асаблівую ўвагу надаваць даходам нізкааплатных катэгорый работнікаў, сёння іх большая частка засяроджаная ў бюджэтнай сферы».*

## КАРАТКА

- **Толькі 21 лютага ў Музеі кнігі Нацбібліятэкі можна ўбачыць рукапіс у чатырох сшытках перакладу Евангелля на беларускую мову Міхася Міцкевіча, малодшага брата Якуба Коласа.**

- Мінск, Брэст і Гродна прызнаны найлепшымі па ўмовах вядзення бізнесу ў Беларусі.
- **У Гомельскай вобласці прафсаюзы аднавілі 14 незаконна звольненых у 2018 годзе работнікаў.**
- У Брэсце на рагу вуліцы Куйбышава і праспекта Машэрава, дзе пачалося будаўніцтва жылога квартала, выяўлена масавае пахаванне часоў Вялікай Айчыннай вайны. Знойдзены астанкі каля 600 чалавек.
- **Амаль восем вакансій прыпадае на аднаго беспрацоўнага ў Мінскай вобласці.**

ISSN 1990 - 763X

# РОДНЫЯ КВЕТКІ

Родная мова для нашага падпісчыка з саракатрохгадовым стажам Васіля ВЯРЭНІЧА — гэта як дыхаць паветрам, жыць любімай справай, працаваць, любіць сваё Палессе. Васіль Афанасьевіч жыве ў вёсцы Ленін Жыткавіцкага раёна, ён былы педагог і дырэктар сярэдняй школы, цяпер на пенсіі. Ніколі не хавае, што любіць нашу газету «найперш за яе шчырае роднае слова». А вось любімы клопат нашага «звяздоўца» — вырошчванне кветак і асабліва руж: ажно семдзесят восем сартоў узыходзяць сёлета ў цяпліцы нашага падпісчыка! А сартоў кветак больш за дзвесце. Усе саджанцы і ў цяпліцы Васіля Афанасьевіча, і на агародзе падпісаны толькі на роднай мове.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Шляхі-дарогі

# ШТО КАРТА СКАЖА?

**У чым перавага папяровых картаў перад анлайн-версіямі і чаму выданні на беларускай мове — гэта стапрацэнтны эксклюзіў, даведалася карэспандэнт «Звязды».**

**«Вялікі гістарычны атлас Беларусі» быў прызнаны найлепшым на нацыянальным конкурсе «Мастацтва кнігі» ў намінацыі «Трыумф».**

## Адказнасць за кожную рыску

Рабочы стол **галоўнага рэдактара РУП «Белкартаграфія» Галіны ЛЯХАВАЙ** не відаць пад стосам шырокіх рознакаляровых лістоў. Прыглядаюся да іх — вуліцы Гродна. У руках жанчына трымае аловак і ўручную ўносіць на паперу рэдактарскія ўказанні.

СТАР. 4

Камунальныя стасункі

# Пластыкавая «вопратка» для прадуктаў

## Карысць, шкода і альтэрнатывы шматслойнай упакоўкі

**Гэта не проста тара, а цэлая тэхналогія, якая дазваляе людзям спрасціць жыццё і зрабіць яго больш камфортным. З аднаго боку, гэта карыснае дасягненне навукі, дзякуючы якому ежа даўжэй захоўваецца несапсаванай, а тавары не губляюць сваю форму і знешні выгляд і добра пераносяць самыя доўгія транспарціроўкі. Нарэшце, яркая абгортка проста радуе вока пакупніка.**

**А з другога — усе карысныя для прадукцыі ўласцівасці ўпакоўкі — яе трываласць, непарушальнасць цэласнасці, супраціўленне хімічным уздзеянням — дрэнна адбіваюцца на экалогіі. І ўсё часцей гучаць меркаванні, што шкоды ад яе больш, чым карысці.**

СТАР. 13

Ва ўрадзе

# СКАЗАНА — ЗРОБЛЕНА

## Ключавая задача на 2019 год — павышэнне эфектыўнасці і канкурэнтаздольнасці дзяржсектара

**Пра гэта паведаміў прэм'ер-міністр Сяргей РУМАС на пасяджэнні Савета Міністраў, дзе абмяркоўваліся вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця ў 2018 годзе, ацэнка першага квартала і выкананне ключавых параметраў 2019 года.**

Паводле слоў Сяргея Румаса, гэтая задача датычыцца як рэспубліканскіх, так і камунальных прадпрыемстваў, паколькі сёння фактычна не працуюць рынкавыя інструменты для фінансавага аздараўлення кампаній. Пры гэтым многія дзяржаўныя арганізацыі разлічваюць выключна на бюджэтную падтрымку.

Нагадаем, выходзячы з патрабаванняў кіраўніка дзяржавы ўрад выключыў унясенне на разгляд Прэзідэнта пытанняў, звязаных з прамой бюджэтнай падтрымкай прадпрыемстваў. Прэм'ер-міністр падкрэсліў: калі кампанія не выконвае ўмовы аказанай дзяржпадтрымкі, яна не мае права разлічваць на яе ў далейшым. Калі ёсць пазітыўныя зрухі, то ў выключным выпадку ўрад можа разгледзець магчымасць рэструктурызацыі запазычанасці, але ўсё будзе праходзіць пад жорсткім кантролем і, як правіла, са зменай кіраўніка.

Яшчэ сёлета ўрад зоймецца выбудоўваннем карпаратыўнага кіравання на дзяржпрадпрыемствах. Падрыхтаваны праект указа, згодна з якім прадугледжана прызначэнне прадстаўнікамі дзяржавы вышэйшых службовых асоб у назіральныя саветы найбольш значных акцыянерных таварыстваў з доляй дзяржавы ў статутных фондах. Такім чынам, упэўнены Сяргей Румас, назіральныя саветы перастануць быць фармальнымі органамі.

Некалькі слоў аб выніках мінулага года: прэм'ер-міністр звярнуў увагу, што з сямі найважнейшых паказчыкаў прагнозу не выкананы выніковы — тэмп росту ВУП, які на 0,5 працэнтнага пункта «не дацягнуў» да прагнозу (103 % пры плане 103,5 %). Ён адзначыў важнасць таго, што эканамічны рост у 2018 быў забяспечаны пры захаванні макраэканамічнай збалансаванасці.

«Сфарміравана станоўчае сальда знешняга гандлю ў памеры амаль 700 мільёнаў долараў. Вынік гэты лепшы, чым у мінулым годзе. У прагнозным калідоры ўтрымана інфляцыя. Цэнавая стабільнасць і рост грашовых даходаў насельніцтва спрыялі росту на ўнутраным спажывецкім рынку», — дадаў ён.

Таксама Сяргей Румас прынцыповым пытаннем сярод задач на гэты год назваў забеспячэнне выканання параметраў пяцігадовай праграмы, паведамляе сайт Савета міністраў.

Казаў і пра будаўніцтва жылля для шматдзетных сем'яў на 2019 год. Так, для гэтай катэгорыі сем'яў сёлета будзе пабудавана 12 тысяч кватэр або 960 тысяч квадратных метраў. Прэм'ер-міністр заклікаў Міністэрства архітэктуры і губернатараў да 15 сакавіка сфарміраваць адзіную табліцу: што гэта будуць за дамы і што гэта будуць за людзі, якім пабудуюць кватэры.

Парламенцкі дзённік

# Закон для экспертаў, які важны для кожнага

## У краіне распрацуюць адзіныя падыходы пры правядзенні судовых даследаванняў

**Для ўнясення ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу рыхтуецца праект новага для Беларусі закона «Аб судова-экспертнай дзейнасці». Дэпутаты асабіста пазнаёміліся з работай Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз.**

«Зладзеі яшчэ не паспелі распакаваць нарабаванае, а ў дзверы ўжо пастукала міліцыя. Адбіткі пальцаў ледзь не ў рэжыме рэальнага часу «выдалі» злачынцаў», — тлумачыць **старшыня камітэта Андрэй ШВЕД,** дэманструючы самае сучаснае абсталяванне. І гэта далёка не ўсё, на што здольныя прафесіяналы камітэта пры дапамозе спецыяльных тэхнічных сродкаў.

Штогод вядзенне крыміналістычных улікаў спрыяе раскрыццю больш чым 20 тысяч злачынстваў. Адбіткі пальцаў — гэта першае, што недасведчаны чалавек прыгадае пра работу судовага эксперта, але спецыялісты камітэта праводзяць каля 160 тысяч відаў і падвідаў даследаванняў: ад зброі і дакументаў да каштоўных камянёў. Наяўнасць у аб'екце забароненых да абароту рэчываў вызначаецца кругласутачна на працягу 40 хвілін.

Працуюць мабільныя лабараторыі, выхоўваюцца новыя прафесіяналы, не застаецца пытанняў без адказу — раскрываюцца нават даўнія злачынствы... Да таго ж камітэт паспяхова зніжае бюджэтныя выдаткі на дарагія прыборы, якім няма аналагаў. Апошніх застаецца ўсё менш: прадукцыя «Белсудэкспертзабеспячэння» ў стане канкурыраваць з імпартнай. Калісьці эксперты павінны былі яшчэ скеміць, як без лішніх слядоў давезці да лабараторыі адабраны, напрыклад, мабільны тэлефон ці шпрыц. Зараз такога пытання няма: калі ласка, ёсць спецыяльная ўпакоўка беларускай вытворчасці. Як і крыміналістычныя сродкі, і праграмнае забеспячэнне.

Нядзіўна, што пераймаць беларускі досвед імкнуцца не толькі краіны постсавецкай прасторы: у Беларусі ў 2013 годзе створаны адзіны экспертны орган, які аб'яднаў розныя галіны. У 2015-м прыняты закон аб камітэце судэкспертыз. За гэты час значна скараціліся тэрміны разгляду спраў у судах і расследавання крымінальных спраў. Раней зняволеныя маглі чакаць экспертных заключэнняў да 12 месяцаў, зараз — за рэдкім выключэннем — 30 дзён. А па кожнай крымінальнай справе ў Беларусі праводзіцца мінімум па 2-3 экспертызы, часам да дзясяткаў.

Самастойныя заканадаўчыя акты па судовай дзейнасці ёсць у Казахстане, Кыргызстане, Украіне, Малдове і іншых краінах. Але ў іх няма аналагаў нашага камітэта. Беларусь, такім чынам, пачала з практыкі і вось падышла да стварэння адпаведнага закона. Для лепшага разумення асаблівасцяў працы «навуковых суддзяў», як іх

часам называюць, парламентарыі (далёка не ўсе з якіх — юрысты) пазнаёміліся з гісторыяй, сучаснасцю і перспектывамі камітэта.

«Ніводная сесія Палаты прадстаўнікоў не абыходзіцца без разгляду законапраектаў, накіраваных на ўдасканаленне працэсуальнага заканадаўства. Новы закон павысіць эфектыўнасць судова-экспертнай дзейнасці, вынікавасць барацьбы са злачыннасцю, абарону правоў грамадзян», — падкрэсліў **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Баляслаў ПІРШТУК.**

Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Наталлі ГУЙВІК,** у адпаведнасці з планам падрыхтоўкі законапраектаў на 2019 год, зацверджаным Прэзідэнтам, праект закона аб судова-экспертнай дзейнасці будзе ўнесены ў Палату прадстаўнікоў у найбліжэйшы час.

Законапраект рыхтуецца Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававых даследаванняў і будзе ўнесены ад імя Прэзідэнта. У дакументе будуць прадугледжаны агульныя стандарты для Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, прыватных экспертаў (іх у краіне больш за дзве тысячы) і экспертаў сумежных структур — пагранічнага і мытнага камітэтаў, Камітэта дзяржаўнай бяспекі.

Галоўная задача новага законапраекта — абараніць правы грамадзян пры правядзенні судовых экспертыз. Як падкрэсліў **дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Вадзім ІПАТАЎ,** дагэтуль не забяспечана сістэмнае рэгуляванне судова-экспертнай дзейнасці, няма адзіных падыходаў да допуску работнікаў.

Таму ў праект закона ўключаны абавязковая атэстацыя асоб, якія жадаюць атрымаць права праводзіць экспертызы, і ліцэнзаванне недзяржаўных установ. Экспертам плануецца дазволіць уключаць у заключэнне ўласныя меркаванні, наконт якіх не былі пастаўлены пытанні.

Закон павінны ўрэгуляваць і тэрміны правядзення экспертыз (як правіла, не больш за 30 каляндарных дзён для ўстаноў усіх формаў уласнасці).

Праект датычыцца і правоў і абавязкаў фізічных асоб, у адносінах да якіх праводзіцца судовая экспертыза, — дагэтуль іх прававое становішча не замацавана. Калі даследаванне праводзіцца прымусова (напрыклад, чалавек змешчаны ў стацыянар), ушчамленне некаторых правоў непазбежнае і патрэбна для належнага правядзення экспертызы, бяспекі самой асобы ці іншых людзей. Частка праекта закона вызначае ўмовы і месца правядзення экспертызы, аб'ектам якой з'яўляецца фізічная асоба.

«Аб'ектыўнасць. Гонар. Айчына» — для экспертаў дзяржаўнага камітэта гэта больш, чым словы. Гэта кошт іх заключэння па канкрэтнай экспертызе, ад якога можа залежаць бяспека ўсёй краіны. Ці лёс аднаго чалавека.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Дональд Трамп падпісаў дырэктыву аб стварэнні Касмічных сіл ЗША

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп 19 лютага падпісаў дырэктыву аб пачатку працэсу стварэння Касмічных сіл у якасці шостага падраздзялення міністэрства ВПС ЗША, паведамляе Reuters.

Новае падраздзяленне ВПС будзе адказваць за шырокі шэраг касмічных ваенных магчымасцяў ЗША — пачынаючы ад спадарожнікаў, якія падтрымліваюць Глабальную сістэму пазіцыянавання (GPS), і заканчваючы датчыкамі, якія дапамагаюць адсочваць пускі ракет. Касмічныя сілы будуць мець статус, аналагічны статусу Корпуса марской пяхоты, які таксама з'яўляецца асобным відам узброеных сіл і мае ўласнага камандуючага ў статусе начальніка штаба, аднак знаходзіцца ў падпарадкаванні міністэрства ВМС ЗША.

На цырымоніі падпісання дырэктывы ў Авальным кабінеце прэзідэнт ЗША назваў Касмічныя сілы прыярытэтам нацыянальнай бяспекі.

## МЗС Швецыі выклікае пасла Венгрыі з-за выказвання віцэ-прэм'ера

Пасол Венгрыі ў Швецыі выкліканы ў міністэрства замежных спраў каралеўства. Прычынай стала рэакцыя венгерскага віцэ-прэм'ера Жольта Шэм'ена на выказванне міністра сацыяльнага страхавання Швецыі Анікі Страндхел. Пра гэта паведаміла Sveriges Radio.

«Тое, што адбываецца ў Венгрыі, выклікае трывогу. Цяпер прэм'ер-міністр Венгрыі Віктар Орбан хоча, каб з'явілася больш «сапраўдных» венгерскіх дзяцей. Палітыка навявае ўспаміны аб 30-х гадах», — напісала Страндхел на мінулым тыдні ў «Твітэры». Пасля гэтага запісу МЗС Венгрыі выклікала да сябе пасла Швецыі ў Будапешце і выказала яму пратэст.

Венгерскі віцэ-прэм'ер Жольт Шэм'ен назваў у сваю чаргу Аніку Страндхел «беднай істотай». «Чаго павінна хацець Венгрыя, як не нараджэння венгерскіх дзяцей... Я думаю, тое, што сказала гэта бедная істота, само з'яўляецца самой ненармальнасцю», — цытуе Шэм'ена тэлеканал СВТ.

## Раскосмас запускае праект аблёту Зямлі турыстамі па «гагарынскім» маршруце

Будучыя касмічныя турысты змогуць паўтарыць палёт Юрыя Гагарына, абляцеўшы Зямлю за адзін віток. Такі праект запускае Раскосмас, паведаміў у аўторак кіраўнік дзяржкарпарацыі Дзмітрый Рагозін.

«Запускаем праект аблёту Зямлі па кароткім «гагарынскім» маршруце, што дазволіць скараціць тэрміны падрыхтоўкі да палёту ахвотных убачыць нашу планету з космасу», — напісаў Рагозін у «Твітэры».

У аўторак у Раскосмасе паведамілі аб падпісанні з кампаніяй Space Adventures новага кантракту на палёт двух касмічных турыстаў, якія да канца 2021 года адправяцца на Міжнародную касмічную станцыю на адным караблі.

Гагарын стаў першым у свеце чалавекам, які ажыццявіў касмічны палёт. На караблі «Усход-1» ён 12 красавіка 1961 года зрабіў адзін віток вакол Зямлі. Яго палёт працягваўся 108 хвілін.

# 51 КРАІНА І 70 МІЛЬЁНАЎ ДОЛАРАЎ

## Дасягненні арганізацыі гуманітарнай дзейнасці ў краіне за мінулы год агучылі на спецыяльнай прэс-канферэнцыі

**Як адзначыла начальнік упраўлення гуманітарнай дзейнасці Дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Беларусі Інга ГАРБУНЦОВА, вынікам усёй дзейнасці ў гэтым кірунку стала супрацоўніцтва Беларусі з 51 краінай па выніках 2018 года.**

«Амаль 70 мільёнаў долараў фінансавых рэсурсаў у эквіваленце паступіла на рэалізацыю розных сацыяльных праектаў», — падкрэсліла спецыяліст.

Назіраецца станоўчая дынаміка — у 2017 годзе сума дапамогі склала 59,8 млн долараў.

Яна звярнула ўвагу, што прыярытэты рэалізацыі сродкаў застаюцца ранейшымі — гэта ахова здароўя, абарона дзяцей, састарэлых грамадзян, навакольнага асяроддзя, укараненне рэсурсазберагальных тэхналогій.

Інга Гарбунцова таксама адзначыла, што ўся праца па дамоўленасцях, якія былі дасягнуты ў 2018 годзе, ужо дае вынік. Напрыклад, літаральна некалькі дзён таму прыбыў першы груз лекавых сродкаў на суму 2,2 млн долараў з ЗША. Паводле яе слоў, гэта доўгатэрміновы праект, звязаны з пастаўкамі найбольш запатрабаваных лекаў у Беларусь.

Дарэчы, на сёння пры ўдзеле беларускага пасольства ў ЗША наладжваюцца сувязі з больш чым дзесяццю найбуйнейшымі дабрачыннымі арганізацыямі Злучаных Штатаў Амерыкі. Спецыяліст выказала надзею, што дадатковыя аб'ёмы дапамогі з ЗША па выніках 2019 года могуць перавысіць паказчыкі апошніх гадоў (10—12 млн долараў) і перасягнуць бар'ер у 15 млн долараў.

...На той жа прэс-канферэнцыі першы намеснік начальніка ўпраўлення аварыйна-выратавальных службаў і ліквідацыі надзвычайных сітуацый Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі Аляксей Іофэ расказаў пра тое, якім краінам Беларусь аказала гуманітарную дапамогу ў 2018 годзе.

Так, у студзені мінулага года груз быў накіраваны пацярпелым ад трапічных тайфунаў і разбуральных паводак у В'етнам. Гэта прадукты харчавання, палаткі, коўдры, генератары энергіі, ложкі-раскладанкі.

Аўтамабільным транспартам быў дастаўлены груз ва Украіну. Былі накіраваны два грузавыя аўтамабілі, а таксама аўтамабілі з халадзільнікамі і школьнай мэбляй.

Яшчэ ў мінулым годзе Беларусь адправіла свой верталёт для тушэння пажараў у Латвію.

Акрамя таго, у 2018 годзе чарговы раз было прынята рашэнне аб аказанні гуманітарнай дапамогі Сірыі. Дарэчы, быў прапрацаваны новы маршрут дастаўкі — з дапамогай чыгуначнага, а потым марскога транспарту. «Цяпер дадзены груз ужо, скажам так, фактычна дастаўлены ў Сірыйскую Арабскую Рэспубліку. Кантэйнеры дастаўлены, і грузавы транспарт айчыннай вытворчасці — самазвал і аўтобус МАЗ, яны ідуць іншым паромам — будзе перададзены ва ўстаноўленым парадку», — дадаў ён.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

## Сталічны час

❍ Сямейны капітал у Мінску з 2015 года прызначаны 9656 шматдзетным сем'ям, паведаміла старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанна Рамановіч на выніковай калегіі ведамства, перадае карэспандэнт БелТА. Сямейны капітал — гэта аднаразовае выдзяленне сем'ям безнаяўных грашовых сродкаў у памеры $10 тысяч пры нараджэнні, усынаўленні (удачарэнні) трэцяга або наступных дзяцей. Рэалізаваць права на прызначэнне сямейнага капіталу можна толькі адзін раз.

❍ У сталіцы ў студзені гэтага года арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 344 новыя кватэры, а летась за аналагічны перыяд было 278, паведамілі ў галоўным статыстычным упраўленні горада Мінска. Усяго ўведзена ў эксплуатацыю 25,2 тыс. кв. м агульнай плошчы жылля.

❍ Саюз пісьменнікаў Беларусі правядзе паэтычны флэшмоб «Роднае слова, цудоўнае слова» ў Міжнародны дзень роднай мовы (21 лютага) на цэнтральным чыгуначным вакзале Мінска, паведаміў карэспандэнту БелТА старшыня саюза Мікалай Чаргінец. Падчас паэтычнага флэшмобу выступяць лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Мікалай Мятліцкі, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Міхаіл Пазнякоў, заслужаны дзеяч мастацтваў кампазітар-выканаўца Алег Елісеенкаў і народны артыст Эдуард Ханок.

## Бяспека

# Губернатары прайшлі агнявую падрыхтоўку

**На базе 51-й артылерыйскай брыгады прайшоў збор «Ваенная бяспека і абарона Рэспублікі Беларусь» са старшынямі выканаўчых камітэтаў абласцей і Мінска, іх намеснікамі, якія курыруюць пытанні тэрытарыяльнай абароны, паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны.**

Фота БелТА.

Падчас збору яго ўдзельнікі азнаёміліся з асноўнымі тэндэнцыямі развіцця ваенна-палітычнага становішча. Яны наведалі выстаўку, дзе былі прадстаўлены асноўныя сродкі агнявога паражэння, якія ёсць ва Узброеных Сілах і тэрытарыяльных войсках, іх магчымасці. Затым каля вёскі Пратасевічы быў паказаны прыклад нанясення магутнага агнявога ўдару ракетных падраздзяленняў, а на палігоне Асіповіцкі прайшлі практычныя вучэнні па стральбе з мінамётаў і процітанкавых гармат.

Як запэўніў **начальнік упраўлення тэрытарыяльнай абароны — намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі Андрэй ПАСЕКА**, асабовы склад вайскоўцаў запасу, які браў удзел у зборах, упэўнена выканаў пастаўленую задачу, паразіўшы ўсе цэлі ўмоўнага праціўніка. Як адзначыў на тэарэтычных занятках **міністр абароны Беларусі Андрэй РАЎКОЎ**, кожны збор мае сваю накіраванасць, перадае БелТА. З 2016 года разгледжаны пытанні фарміравання тэрытарыяльных войскаў, арганізацыі тэрытарыяльнай абароны, аховы абаронных аб'ектаў і ўвядзення ваеннага становішча.

Падчас папярэдняга збору, які прайшоў у Брэсцкай вобласці, быў вывучаны парадак баявога прымянення ваенных часцей і Узброеных Сіл сумесна з падраздзяленнямі тэрытарыяльных войскаў, акцэнт быў зроблены на абароне населеных пунктаў. На цяперашніх зборах асноўная ўвага надавалася агнявому паражэнню праціўніка. «Як паказваюць ваенныя канфлікты апошніх гадоў, гэта з'яўляецца важным фактарам для дасягнення мэт любога супрацьстаяння», — падкрэсліў Андрэй Раўкоў.

**Ул. інф.**

# «Карані травы»: дапамога пашырана

**Амаль 110 тысяч долараў атрымаюць ад кіраўніцтва Японіі ў якасці грантаў медыцынскія, сацыяльныя і адукацыйныя ўстановы ў рэгіёнах Беларусі.**

Дзякуючы гэтаму Гомельскі абласны клінічны анкалагічны дыспансер зможа набыць апарат ультрагукавой дыягностыкі на суму больш за 75 тысяч долараў. Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Віцебскага раёна атрымае грант на 26 тысяч долараў для набыцця аўтамабіля для пасажыраў з абмежаванымі магчымасцямі. А сярэдняя школа № 2 Століна закупіць вулічны трэнажорны комплекс за 8,5 тысячы долараў. Агульная сума выдаткаваных сродкаў складае 109 789 долараў.

Сродкі выдаткоўваюцца ў межах праграмы «Карані травы» — грантавая дапамога для праектаў па забеспячэнні бяспекі чалавека». Так кіраўніцтва Японіі дапамагае людзям, пацярпелым ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і яе наступстваў. Раней сродкі выдаткоўваліся толькі ўстановам аховы здароўя, сёлета іх атрымаюць школы і цэнтры сацыяльнага абслугоўвання.

Кантракты на ўрачыстай цырымоніі кіраўнікам названых устаноў уручыў пасол Японіі ў Беларусі Хірокі Такунага. Гэтыя праекты стануць 46-м, 47-м і 48-м, рэалізаванымі ў межах праграмы «Карані травы». Агульная сума грантаў, выдадзеных Беларусі з 2004 да 2019 года, складае больш за 3,8 мільёна долараў.

**Алена КРАВЕЦ.**

## Ведай нашых!

# ЮНІБАЙК ДЛЯ ЭМІРА

**Дубай першым у свеце ўкарэніць новы від транспарту. Яго распрацавалі беларусы.**

Аб гэтым паведамляюць арабскія CMI са спасылкай на Dubai Media Office і афіцыйны сайт правіцеля Дубая.

У ААЭ прайшоў Сусветны ўрадавы саміт. На ім прадстаўнікі 140 краін і міжнародных арганізацый абмеркавалі інавацыі ў галіне навукі, тэхналогій і глабальнага кіравання. У рамках саміту Міністэрства транспарту Дубая правяло прэзентацыю новага праекта Dubai Sky Pods. Гэта транспартная сістэма эстакаднага тыпу, вядомая як струнны транспарт SkyWay (СкайВэй). Яе распрацавала беларуская кампанія «Струнныя тэхналогіі».

З сістэмай азнаёміўся эмір Дубая Мухамед бен Рашыд аль-Мактум, які адначасова з'яўляецца прэм'ер-міністрам і віцэ-прэзідэнтам Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў. Яму паказалі дзве мадэлі струннага транспарту — двухмесны юнібайк і шасцімесны юнікар, якія могуць рухацца з хуткасцю да 150 кіламетраў за гадзіну. Новы від транспарту беспілотны — модулямі кіруе бартавы камп'ютар і аўтаматызаваны цэнтр кіравання.

У арабскіх медыя адзначаюць: гэтая сістэма займае значна меншую плошчу, чым звычайныя транспартныя сістэмы той жа прадукцыйнасці. Яна таксама характарызуецца больш высокай энергаэфектыўнасцю, бо спажывае ў пяць (!) разоў менш энергіі, чым электрамабілі.

Зараз беларускія распрацоўшчыкі праводзяць тэсціраванне рухомага саставу, адаптаванага да блізкаўсходняга клімату, паведамляе інфармацыйная служба ЗАТ «Струнныя тэхналогіі».

**Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**

## ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### ЗАЧАПІЎ КУЗАВАМ ГАЗАПРАВОД

**У Мікашэвічах грузавік, праязджаючы пад эстакадай, зачапіў трубу газаправода. Здарэнне адбылося на тэрыторыі прамысловай зоны.**

Высветлілася, што грузавік МАЗ 5516, выязджаючы з яе з неапушчаным кузавам праз эстакаду, зачапіў трубу газаправода. У выніку ДТЗ адбылася дэфармацыя і змяшчэнне стальнога газаправода сярэдняга ціску дыяметрам 159 міліметраў і даўжынёй 41 метр, удакладнілі ў МУС.

Уцечкі газу не адбылося дзякуючы таму, што спрацаваў клапан-адсякальнік на рэгулятарным пункце. Пацярпелых няма. Было прыпынена газазабеспячэнне кацельні. Прычына здарэння высвятляецца.

### СКРАЛІ З ФУРЫ ГУМОВЫ АБУТАК І ШЫНЫ

**Інцыдэнт адбыўся ўначы. Па дапамогу да праваахоўнікаў звярнуўся кіроўца аўтамашыны DAF, які спыніўся для адпачынку на АЗС у Аршанскім раёне, размешчанай уздоўж трасы Е95.**

Мужчына паведаміў, што за час двухгадзіннага сну невядомыя асобы выкралі з паўпрычэпа прызначаную для рэалізацыі ў гандлёвых сетках вобласці партыю гумовага абутку і аўтапакрышкі, якія належаць ААТ «Белшына». Сума шкоды склала каля 3,5 тысячы рублёў, паведамілі ў МУС.

Міліцыянеры вызначылі асобы зламыснікаў. У ноч крадзяжу яны пад'ехалі да фуры на мікрааўтобусе і, скарыстаўшыся абставінамі, перагрузілі частку грузу з яе ў свой аўтамабіль. Падазраваныя ў здзяйсненні злачынства — 32- і 31-гадовы жыхары Оршы — затрыманы. Выкрадзеныя таварна-матэрыяльныя каштоўнасці выяўлены на складзе, арандаваным адным са зламыснікаў у якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Зараз праводзіцца работа па ўстанаўленні магчымай датычнасці затрыманых да іншых фактаў крадзяжоў.

### ПАДРОБАК ГРОШАЙ СТАНОВІЦЦА МЕНШ

**У мінулым годзе ў краіне было зафіксавана 810 фактаў фальшываманецтва, паведамляе Міністэрства ўнутраных спраў.**

У 96 працэнтах выпадкаў з агульнай колькасці зарэгістраваных фактаў фальшываманецтва прадметам правапарушэнняў стала замежная валюта (779 фактаў), і толькі ў 4 працэнтах — беларускія рублі (31 факт).

У 2018 годзе ў параўнанні з папярэднім колькасць фальшывак зменшылася на 12,2 працэнта (810 супраць 922). Падобная тэндэнцыя захоўваецца на працягу некалькіх гадоў.

Як паказвае практыка, фальшывая замежная валюта вырабляецца на высакаякасным паліграфічным абсталяванні, беларускія падробкі — гэта намаляваныя або надрукаваныя на звычайных прынтарах купюры, вырабленыя ў хатніх умовах.

У большасці выпадкаў падробленая замежная валюта прывозіцца ў краіну так званымі добрасумленнымі набытчыкамі (турыстамі, грамадзянамі, якія выязджаюць за мяжу для працаўладкавання, у госці да родных і блізкіх, а таксама прадпрымальнікамі, што закупляюць імпартныя тавары). Фальшыўкі паступаюць на ўнутраны рынак і задзейнічаюцца пры ажыццяўленні незаконных валютных аперацый, г. зн. пры абмене паміж фізічнымі асобамі, набыцці тавараў па-за рознічнай сеткай — на рынках, у інтэрнэт-крамах, па прыватных аб'явах.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО КАРТА СКАЖА?

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

— Гэта толькі здаецца, што развіццё тэхналогій значна спрасціла працэс стварэння картаў. Вядома, лініі пяром з тушшу цяпер ніхто не наносіць, аднак камп'ютар поўнасцю работу не выконвае. Ён толькі інструмент. Кожная карта — гэта калектыўны прадукт, над якім працуе не менш за дзесяць чалавек: уласна картограф-выканаўца, тэхнолаг, рэдактар, галоўны рэдактар, карэктар, інжынер-сістэматэхнік, мастак і іншыя, — расказвае **дырэктар прадпрыемства Іна ШЛЫК.**

Але ці вартыя такіх намаганняў вынікі ў наш час, калі ў кожнага ў смартфоне — «Google.Maps» і «Яндэкс.Карты»? Безумоўна. Унесці праўкі ў анлайн-сэрвісы можа любы. Прычым, як карысныя, так і шкодныя. Адзін з нядаўніх сумных прыкладаў якраз закрануў Брэсцкую крэпасць. На Google.Maps скульптурная кампазіцыя «Смага» была перайменавана ў «Прагу хуткасці» («Жажду скорости»). Віртуальны вандалізм у чыстым выглядзе. Жыхары Брэста, як толькі ўбачылі гэты жах, забілі трывогу і вярнулі скульптуры яе сапраўднае імя.

Іна ШЛЫК.

Першая запатрабаваная замежнымі турыстамі (асабліва напярэдадні міжнародных спартыўных спаборніцтваў, якія часта ладзяцца ў краіне), апошняя — масавым пакупніком. А вось выданні на роднай мове маюць зусім невялікія тыражы, калі не браць у разлік вучэбныя матэрыялы для школьнікаў.

Штатнага перакладчыка ў «Белкартаграфіі» няма. Ён тут па вялікім рахунку і не патрэбны. Назвы населеных пунктаў і геаграфічных аб'ектаў у беларускім і рускім варыянце рэгламентуюцца Дзяржаўным каталогам геаграфічных назваў.

— Даўно склаліся добрыя стасункі з Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа пры Нацыянальнай акадэміі навук. Калі ўзнікаюць нейкія спрэчныя моманты, звяртаемся да іх, — расказвае дырэктар.

— Мы нясём адказнасць за кожную рысачку на нашых картах, працуем у цеснай сувязі з дзясяткамі арганізацый і экспертаў. Усе даныя і назвы вывяраюцца па некалькіх крыніцах, — запэўніваюць на прадпрыемстве. — Вядома, анлайн-карты больш гібкія ў плане актуальнасці звестак. Аднак яны не адлюстроўваюць дынамікі. Мы бачым толькі тое, што ёсць у пэўны момант. Як выглядала тое ці іншае месца 10, 20, 50 гадоў таму, можна прасачыць толькі па фіксаваных носьбітах. Акрамя таго, інтэрнэт-сэрвісы даюць толькі абагульненую інфармацыю. Нашы матэрыялы ў залежнасці ад скіраванасці маюць падрабязнае апісанне аб'ектаў. Гэта карты турыстычныя і дарожныя, раённыя і гарадскія, азёр і вадасховішчаў, дзіцячыя і вучэбныя, палітычныя і эканамічныя, прамысловыя, сельскагаспадарчыя і г. д.

## Эксклюзіў на роднай мове

Цяпер беларускія картографы выпускаюць прадукцыю на трох мовах — англійскай, беларускай і рускай. Дарэчы, цікавае супадзенне: Дзень работнікаў землеўпарадкавальнай і картографа-геадэзічнай службы супадае з Днём роднай мовы. Натуральна, яны хочуць унесці лепту ў падтрыманне прэстыжу сваёй культуры. Возьмем да прыкладу нашумелы чатырохтомны «Вялікі гістарычны атлас Беларусі», які ўжо стаў бібліяграфічнай славутасцю.

— Гэта выданне фундаментальнае, але яно не з тых, якія ставяць на паліцу ў якасці ўпрыгажэння. Акрамя архіўных матэрыялаў, у кожнай частцы атласа маецца генеральная карта тэрыторыі Беларусі ў маштабе 1:300 000. На ёй мы можам убачыць, як выглядаў той ці іншы куточак краіны ад старажытнасці да нашых дзён, — расказвае Галіна Ляхава і нечакана пытаецца: — Вы дзе нарадзіліся? Давайце глянем на вашу малую радзіму ў першай палове XVIII стагоддзя.

Адкрываем другі том атласа, знаходзім поўдзень сучаснай Беларусі і замест сённяшняй вёскі Вулька-1 бачым Вольку Харлінскую. Тут жа пазначаная інфармацыя, каму належалі гэтыя землі ў той час — пану Друцкаму-Любецкаму. Вось гэта адкрыццё! Ніякі Google такое не выдасць. Глядзім у чацвёрты том, дзе на генеральнай карце нанесеныя ўсе населеныя пункты, якія існавалі на тэрыторыі краіны з 1941 года і ёсць цяпер. Раней побач з маёй вёскай было яшчэ з дзясятак іншых. Адны былі спаленыя падчас вайны, другія зніклі ў выніку аб'яднання з іншымі, трэція проста вымерлі — і ўсё гэта можна ўбачыць на адной карце.

— Стварыць гэта было няпроста. Часам навукоўцы прыносілі спісы з назвамі і каардынатамі, таму некаторыя карты складаліся літаральна з чыстага ліста, — дзеліцца Галіна Паўлаўна.

Адным з хітоў продажу на XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы стала скрэтч-карта Беларусі. Яна мае спецыяльнае пакрыццё, як у латарэйных білетах, пад якім схаваная сакрэтная інфармацыя.

— У нашым выпадку — гэта гербы гарадоў. Наведаўшы той ці іншы раён, уладальнік карты зможа прыбраць пакрыццё з пэўнага ўчастка. Сутнасць скрэтч-карты ў тым, што яна заахвочвае да вандровак. Вось вытрыце вы дзесяць раёнаў, у якіх пабывалі, і вам захочацца паехаць куды-небудзь яшчэ, каб адкрыць астатнія «сакрэцікі», — адзначае Іна Шлык. — Дарэчы, ідэю стварэння геральдычнай скрэтч-карты нам падказаў старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Андрэй Гаеў. У найбліжэйшы час плануецца выдаць такую ж, але з архітэктурнымі помнікамі.

Хоць папяровыя карты па-ранейшаму застаюцца прыярытэтным кірункам прадпрыемства, ад сусветных трэндаў тут імкнуцца не адставаць. Цяпер распачалі работу над інтэрактыўным праектам «Мая радзіма — Беларусь». Да друкаванай асновы дададуць аўдыя, відэа і фота, якія раскажуць пра гістарычныя, культурныя і прыродныя аб'екты. Па аўтэнтычныя матэрыялы выправяцца экспедыцыі па ўсёй краіне.

**Ганна КУРАК,**
**фота аўтара.**

Экслібрыс «Звязды»

# «МОЙ РОДНЫ КРАЙ ДОЎГАЦЯРПЛІВЫ...»

**У выдавецтве «Беларуская навука» выйшаў чарговы том серыі «Беларускі кнігазбор». 98-ы — па ліку. Зараз да чытача прыйшлі «Выбраныя творы» паэта, празаіка, публіцыста Івана Ласкова (1941—1994), беларускага пісьменніка, які жыў і працаваў у Расіі, у далёкім ад Мінска Якуцку.**

У адну ёмістую кнігу ўвайшлі вершы на беларускай мове (пісаў Іван Антонавіч і па-руску), паэмы «Трыццаць (Рэквіем)» і «Кульга», раман пра сібірскія прыгоды двух падлеткаў — беларуса і якута — «Стралецкая быліна», падрабязная аўтабіяграфія, аўтабіяграфічны нарыс «Дванаццаць якуцкіх месяцаў», публіцыстычныя і навуковыя артыкулы. А таксама — у раздзеле «Дадатак»: згадкі пра Івана Ласкова, аўтарамі якіх з'яўляюцца Леанід Дайнека (памяццю пра Ласкова ён падзяліўся вершаванай мовай), Міхась Тычына, Раіса Баравікова, Уладзімір Арлоў. Укладальнік кнігі, аўтар прадмовы і каментарыяў — Любоў Філімонава.

«Мой родны край доўгацярплівы, / Даруй мне кожны каласок, / Што я з тваёй збяднелай нівы / Знёс на чужую незнарок. / І што рабіць — не разумею, / Абкраў цябе, абкраў сябе / І прад табою камянею / З агнём праклянцця на ілбе», — напісаў паўвека назад Іван Ласкоў. Напісаў тады, калі шукаў сябе ў роднай моўнай стыхіі, калі вяртаўся да роднага слова, якім быў выпеставаны яго талент. Першыя свае паэтычныя кнігі Іван Ласкоў выдаў на рускай мове. Вершы яго друкаваліся не толькі ў «Нёмане» і «Знамени юности», але і ў маскоўскіх часопісах — «Новый мир» і «Юность». А пасля Ласкоў пісаў па-беларуску. Трэцяя паэтычная кніга нашага суайчынніка, ды першая — беларуская, «Кружное лета» выйшла ў свет у «Мастацкай літаратуры» ў 1969 годзе. Хоць па-ранейшаму Іван Ласкоў і жыў у Сібіры, у Якуціі, працаваў у якуцкіх перыядычных выданнях.

Іван Ласкоў — аўтар многіх паэтычных і празаічных кніг, якія выйшлі на рускай і беларускай мовах: «Стихия», «Белое небо», «Кружное лета», «Хромец», «Андрэй-Эндрэй — справядлівы чалавек, або Беларус на полюсе холаду», «Ивановы», «Чароўны камень», «Кульга». І вось — новая, напоўненая ўсімі Івана Ласкова мастацкімі і грамадзянскімі перакананнямі кніга «Выбраныя творы». Тыраж невялікі — 500 асобнікаў. Але і гэтыя экзэмпляры могуць адыграць асаблівую ролю ў выхаванні гістарычнай свядомасці беларусаў. Наступная кніга ў выдавецкім праекце «Беларускі кнігазбор» — зборнік твораў Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Легендарныя землякі

# Дзе нараджаюцца зоркі

## У Шчучынскім раёне адзначылі 80-годдзе Чэслава Немена

**Памятныя мерапрыемствы з нагоды юбілею прайшлі на малой радзіме легендарнага рок-музыканта. У вёсцы Васілішкі захаваўся дом, дзе амаль 20 гадоў жыў Чэслаў Выджыцкі, які стаў вядомы як Чэслаў Немен. У доме створаны музей знакамітага земляка. Летась яго наведалі больш за сем тысяч аматараў творчасці спевака з усяго свету.**

Вось і святочнае мерапрыемства пачалося з наведвання дома-музея. Праз асабістыя рэчы і ўспаміны аднавяскоўцаў і сяброў тут можна пазнаёміцца з дзяцінствам і юнацтвам куміра некалькіх пакаленняў. Адзначаўся той факт, што знакаміты музыкант, які жыў у Польшчы, не забываў сваю малую радзіму і паміж гастролямі спяшаўся хутчэй сюды, у сваю вёску на ўзбярэжжы Нёмана. Адсюль і яго псеўданім.

У памяць аб рок-зорцы арганізатары запрасілі ахвотных на літаратурна-музычную кампазіцыю ў Шчучынскі раённы цэнтр культуры. Яго хіты выканалі таленавітыя землякі, у канцэрце прыняў удзел этна-гурт Dzivasil. Імпрэзу наведалі прадстаўнікі раённых і абласных улад, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Польшча ў Беларусі Артур Міхальскі, прадстаўнікі аб'яднанняў палякаў у Беларусі і Расіі.

Падчас вечарыны прэзентавалі кнігу-альбом, якую выдалі кінасцэнарыст Вера Савіна і фотамастак Віталь Раковіч.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**З пачатку лютага дзяржпрадпрыемства «Белгеадэзія» дае доступ усім карыстальнікам сеткі інтэрнэт да дзяржаўнай навігацыйнай карты нашай краіны ў лічбавым фармаце.**

Тэхналогіі

# Навігацыя ў лічбе — для ўсіх

Гэта навігацыйная карта складаецца з трох частак: картаграфічнай падкладкі, дарожнага графа і адраснай інфармацыі.

У якасці картаграфічнай падкладкі выкарыстоўваюцца тапаграфічныя карты маштабу 1:100 000 на ўсю тэрыторыю краіны і маштабу 1:10 000 на тэрыторыі асобных гарадоў і пасёлкаў гарадскога тыпу. Дарожная сетка прадстаўлена дарогамі міжнароднага, рэспубліканскага і мясцовага значэння. У базе даных адраснай інфармацыі змяшчаюцца звесткі пра больш чым 120 гарадоў і пасёлкаў.

Картаграфічная падкладка дзяржаўнай навігацыйнай карты ў выглядзе WMS-сэрвісу можа выкарыстоўвацца ў прыкладных геаінфармацыйных сістэмах. Графічная дакладнасць картаграфічнай падкладкі адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да дакладнасці дзяржаўных тапаграфічных картаў маштабаў 1:100 000 і 1:10 000.

У далейшым функцыянал web-сэрвісу дзяржаўнай навігацыйнай карты будзе пашырацца. Так, па адраснай інфармацыі сэрвіс забяспечыць вызначэнне месцазнаходжання аб'ектаў (сэрвіс геакадзіравання), а па дарожным графе сэрвіс дасць магчымасць пракладваць маршруты руху з рознымі крытэрыямі аптымізацыі (навігацыйны сэрвіс).

Будзе пашырацца таксама і пералік населеных пунктаў з адраснай прывязкай, уключаючы і сельскія населеныя пункты.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

21 ЛЮТАГА 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 4 (15859)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Якаў ЗЯНЬКО:

# «На лёдзе даю волю эмоцыям»



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Ён — адзін з нямногіх прадстаўнікоў беларускага фігурнага катання на міжнароднай арэне. У студзені абараняў гонар краіны на дамашнім чэмпіянаце Еўропы, а цяпер рыхтуецца да юнацкага чэмпіянату свету. У перапынках у сваім шчыльным графіку фігурыст расказаў пра тое, чаму навучыўся ў вядомага трэнера алімпійскіх чэмпіёнаў Этэры Тутберыдзэ, як яго бацькі дзеля кар'еры сына пераехалі ў іншы горад і як яму ўдаецца спалучаць на лёдзе артыстызм з найскладанейшай тэхнікай.**

***— Якаў, для пачатку хацелася б падвесці вынікі чэмпіянату Еўропы ў Мінску, бо эмоцыі пасля турніру ўжо ўлягліся.***

— Калі казаць пра спартыўны складнік, то я застаўся незадаволены сабой: павінен быў паказваць значна лепшы вынік. Лічу, што быў гатовы, але не справіўся псіхалагічна, маральна.

З аднаго боку, выступаць дома было складана, з другога — падтрымлівалі беларускія гледачы вельмі крута, я нават не думаў, што нашы балельшчыкі так могуць.

***— Чэмпіянат Еўропы ў Мінску дадаў вам папулярнасці?***

— Бачыў плакаты са сваімі фотаздымкамі, было вельмі прыемна. Пасля пракату прыйшоў да мамы на трыбуну і, напэўна, хвілін 40 фатаграфаваўся з балельшчыкамі. Мама ўжо скардзіцца пачала. Мне пісалі ў сацыяльных сетках, за дзесяць хвілін пасля майго пракату з'явілася 129 заявак у сябры ў «УКантакце». Але каб пазнавалі на вуліцы, не сказаў бы, можа быць, толькі каля «Мінск-Арэны».

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Карыснае хобі

# «ПРЫРУЧЫЦЬ» ЦЭГЛУ І ГЛІНУ

## Як інжынер-электронік стаў печніком

**«Зімой мы чытаем артыкулы па тэме і нагульваем тлушчык. Я за халады звычайна пяць-сем кілаграмаў набіраю. Але першы аб'ект — і ўсё ўлятае», — жартуе Арцём КОРЗУН. Печы ён складае ўжо больш за дзесяць гадоў. Прызнаецца: праца цяжкая. Але прафесія запатрабаваная. Мы распыталі майстра, што самае складанае ў яго рабоце, якія сёння густы ў заказчыкаў і ці пагадзіўся б ён памяняцца месцамі з праграмістам.**

У пячной справе Арцём, лічы, з дзяцінства.

— Усё пачалася з таго, што бацька мой, Антон Львовіч, купіў лецішча. Трэба было скласці печ, а спецыяліста няма. Таму ён вырашыў рабіць сам, па кніжцы — атрымалася з трэцяга разу. Потым сусед прыйшоў і папрасіў сабе печ. Так і пайшло. Бацька прысвяціў гэтаму ўсё сваё жыццё. Мне рамяство фактычна дасталося ў спадчыну.

Адмысловых курсаў для печнікоў Арцём не заканчваў — са школьных гадоў быў у таты на падсобных работах, пераймаў вопыт. Першыя заказы шукаў праз аб'явы ў газеце, штосьці па дробязі падкідваў бацька — рамонт топкі, коміна.

— Цяпер практычна ўсе кліенты звяртаюцца да мяне па рэкамендацыі. Самая найлепшая рэкламная акцыя — гэта добрая печ. Я гатовы патраціць лішні дзень-два, каб зрабіць усё як след, — кажа мужчына.

Паралельна ён працуе інжынерам-электронікам (некалі скончыў БНТУ, факультэт інфармацыйных тэхналогій і робататэхнікі). Тлумачыць: цалкам пераключыцца на печы немагчыма — гэта вельмі цяжка фізічна.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

Пазнаёміцца з прафесіяй

# ГАЮЧАЯ МОЦ РОДНАГА СЛОВА

## Малады хірург пра дапамогу, адказнасць і інвестыцыі ў здароўе

**— Каб доўга не тлумачыць, як трэба прылегчы пацыенту для агляду, я паказваю карціну Франсуа Бушэ «Вакханка, якая грае на жалейцы» і прашу паўтарыць тое ж на кушэтцы, — сустракае нас у працэдурным кабінеце сталічнай паліклінікі № 28 урач-хірург Дзмітрый КАРОЛЬ. — Бо калі расказваць, што ды як, — працэс зацягнецца. А час сёння «дарагі».**

### «Нават рускамоўны пацыент кажа «дзякуй»

— Я вяду прыём на беларускай мове, і, ведаеце, пацыенты не скардзяцца. Падчас знаходжання на бальнічным шмат хто з маіх «падапечных» таксама пачынае размаўляць на ёй. Сыходзячы, усе пацыенты кажуць «дзякуй», — расказвае ўрач.

На сваё першае месца працы Дзмітрый прыйшоў у жніўні мінулага года. Хлопец скончыў лячэбны факультэт Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— На бюджэтную форму навучання я трапіў пасля перамогі на Рэспубліканскай алімпіядзе па біялогіі. Гэта дазволіла мне не здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне, — расказвае суразмоўнік.

Медыкаў у сям'і Дзмітрыя няма. Ён кажа, што прафесія заўсёды прыцягвала магчымасцю дапамагаць.

— Я бачыў людзей, у якіх былі хібы знешнасці: апёкі, нейкія калецтвы, траўмы. На жаль, яны часта страчваюць сацыялізацыю, замыкаюцца ў сабе. Лічу, што калі невялікія пашкоджанні можна выправіць хірургічна — гэта трэба рабіць! Важна вяртаць людзей да жыцця! Мяне вельмі цікавіць пластычная хірургія. Але я не хачу павялічваць пэўныя органы цела, а планую працаваць з чалавекам як з асобай, — удакладняе хлопец.

Пластычных аперацый малады ўрач пакуль не праводзіць. Дзмітрый выконвае невялікія хірургічныя ўмяшальніцтвы па выпраўленні былых швоў, дзе рубцы, напрыклад, няправільна расслоіліся. Выдаляе розныя дабраякасныя ўтварэнні. Карацей, усё тое, што можна зрабіць ва ўмовах амбулаторыі. «Дзякуй кіраўніцтву паліклінікі, што закупляюць неабходнае для гэтага абсталяванне», — дадае доктар.

### «Больш за ўсё не хапае практыкі»

— На прыёме я заўсёды тлумачу пацыенту, што ў яго за захворванне, этыялогію апошняга. Напрыканцы прашу паўтарыць тое, што сказаў. Дыягназ асобна запісваю для хворага на паперцы, каб той змог пракансультавацца з іншым урачом (некаторым так спакайней) ці пацікавіцца ў іншых крыніцах, — распавядае пра свае прынцыпы работы Дзмітрый.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
21 02 2019 г.

*Пашыраючы прастору*

# Вучыцца пісаць ніколі не позна. І не рана

## Што агульнага паміж творчасцю і «табурэткай»?

**Дзе можна асвоіць літаратурнае майстэрства? Як становяцца пісьменнікамі? Ці трэба для гэтага абавязкова скончыць адпаведны інстытут? Чаму можна навучыцца, а чаму нельга? А ці можа стварыць штосьці вартае ўвагі падлетак, або пакуль не вырасцеш, пісаць не маеш права? Ёсць меркаванне, што існуе ўсяго чатыры тыпы пісьменнікаў: графаманы, дрэнныя, добрыя і геніі. Першую і чацвёртую катэгорыі вучыць немагчыма. З добрага пісьменніка генія таксама не створыш, бо ім трэба нарадзіцца. А вось з дрэннага пісьменніка можна паспрабаваць выхаваць добрага.**

**«Я ў пісьменнікі пайду, няхай мяне навучаць» — менавіта так гучала тэма круглага стала, які прайшоў у рамках нядаўняй Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу. Яго ініцыятарамі выступілі аўтары шматлікіх кніг для дзяцей і падлеткаў Андрэй ЖВАЛЕЎСКІ і Яўгенія ПАСТЭРНАК, якія таксама займаюцца «агранкай» будучых талентаў.**

**Іван БАЧУК, дзевяцікласнік бараўлянскай сярэдняй школы № 2: «Я да канца не верыў, што магу пісаць...»**

### Не скампраметаваць ідэю

**Пісьменніца, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі, кіраўнік аб'яднання «Літаратурнае прадмесце» Людміла РУБЛЕЎСКАЯ** лічыць, што такая вучоба патрабуецца не ўсім, хто імкнецца стварыць. Насамрэч усю сусветную літаратуру можна разглядаць як выдатную школу. Але ў творчых аб'яднанняў (школ, курсаў і гэтак далей) ёсць адна важная перавага: яны ствараюць адпаведны асяродак, у які пагружаюцца іх слухачы. Гэта атмасфера, у якой адзін аднаго падтрымлівае. А самы вялікі бонус для юных удзельнікаў — калі ў цэнтры творчага асяроддзя прысутнічае сталы пісьменнік. Ад дарослых хэдлайнераў патрабуюцца асаблівыя якасці. «Увогуле трэба, каб і вучні падабраліся, і каб атмасфера адпаведная склалася, інакш усё будзе міма, а можа быць, яшчэ і адаб'е жаданне займацца гэтай «падазронай справай». Будзем шчырымі, сёння завабіць маладых людзей у вялікую літаратуру няпроста, і трэба без прыўкрас ім казаць, што за кошт сваіх кніг яны жыць не будуць, — канстатуе Людміла Рублеўская. — Але ж акрамя матэрыяльных ёсць і вельмі важныя нематэрыяльныя рэчы...»

Звычайна школу маладога пісьменніка наведваюць слухачы ва ўзросце 18—20 гадоў і ў больш старэйшым. Але аднойчы адначасова навучаліся 13-гадовая дзяўчына-падлетак і яе бабуля. І ў абедзвюх атрымлівалася няблага пісаць. Гэта лішні раз даказвае, што спасцігаць літаратурнае майстэрства ніколі не позна і ніколі не рана. Жаданне пісаць кнігі можа прачнуцца ў любы момант. «Але заганяць на вучобу нікога ні ў якім разе нельга, бо так лёгка адбіць ахвоту і скампраметаваць саму ідэю, — падкрэслівае Людміла Рублеўская. — Я ведаю маладых людзей, якія змянялі курсы, шукалі тое літаратурнае асяроддзе, якое падыходзіць канкрэтна ім. І яны яго знаходзілі...»

### Пісаць так, каб чапляла

— Думаю, што калі ў чалавеку ёсць іскра божая, то ніякія літаратурныя курсы яго не сапсуюць, — жартуе **пісьменніца Вольга ГРАМЫКА** (выпускніка біяфака БДУ. — **Аўт.**). — Асабіста мяне вучыць — толькі псаваць. Я ніколі не наведвала падобныя курсы, больш за тое, у мяне і ў школе была «тройка» па рускай літаратуры. Я не ведаю, як я пішу, як гэтаму можна навучыць і як гэта можна растлумачыць. І мяне вельмі раздражняе, калі пачынаюць казаць, як трэба пісаць, мяне выводзіць з сябе нават думка пра тое, што неабходна зрабіць план. Кажуць: «Вось вам сітуацыя, апішыце яе прыгожа!» Я не разумею, навошта мне гэта? Я ніколі не пішу чарнавікоў, эсэ, гісторый на зададзеную тэму, каб прапампаваць сваё літаратурнае майстэрства. Для мяне дзіўна, што яму можна навучыць: майстэрства альбо ёсць, альбо яго няма. Так, я чытала аўтабіяграфіі вядомых пісьменнікаў, і мяне заўсёды здзіўляла, што яны насамрэч вучыліся, трэніраваліся, рабілі накіды, па сто разоў перароблівалі, хадзілі ў нейкія студыі, кансультаваліся...

Калісьці я марыла быць мастаком, і калі падчас дэкрэту ў мяне з'явіўся вольны час, вырашыла ім скарыстацца, якраз каб здзейсніць сваю мару: пераканалася на ўласным досведзе, што навучыцца выяўленчаму мастацтву насамрэч можна. А вось як стварыць якасную літаратуру, да сёння не ведаю. Хоць у мяне ўжо выйшла 18 кніг агульным тыражом больш за мільён асобнікаў. Для мяне гэта матэрыя зусім іншага плана. Калі я бачу, якія эсэ пішуць чытачы па маіх кнігах, то вельмі здзіўляюся. Што хацеў сказаць аўтар? Я нават не магу ўявіць сабе, як гэтыя думкі знаходзяць у маіх тэкстах? (*Смяецца*. — **Аўт.**) А чытачы, між іншым, ладзяць літаратурныя дыскусіі. У мяне ёсць знаёмыя філолагі, якія вельмі добра пішуць, але яны не пісьменнікі, а выдатныя рэдактары, журналісты. Аднак як толькі садзяцца пісаць сваю кнігу... Так, атрымліваецца выдатны тэкст, вылізаны, але я яго дачытваю да канца — і ўсё. Ён прайшоў праз мяне транзітам. Добры, якасны, вытрыманы серадняк, які я сабе паставіць на паліцу не хачу. А жадаю зусім іншы, напісаны тым, хто не вучыўся, але сеў і зрабіў так, як яму сэрца падказала...

### Не падрэзаць крылы

А вось **паэтэса, пісьменніца, бард і кіраўнік літаратурнай майстэрні для дзяцей і падлеткаў Таццяна ДАШКЕВІЧ** з'яўляецца выпускніцай Літаратурнага інстытута імя М. Горкага.

— За намі ніколі не было строгага нагляду з боку педагогаў. Гэта была дзівосная школа разумення, і для мяне яна была неабходная, — канстатуе Таццяна. — Нас навучылі цаніць творчую свабоду.

Вельмі сур'ёзны ўплыў на маё станаўленне аказала «малая рэдкалегія» часопіса «Парус». Там мы, падлеткі, сустрэлі дарослых, якія далі нам зразумець, што мы нешта з сябе ўяўляем. Вось калі б не гэты штуршок, можа быць, мы так бы і пісалі ў стол. Таму вельмі важна сустрэць у юным узросце чалавека, які ў цябе паверыць, падтрымае і пакажа твае моцныя бакі.

Цяпер у мяне дваццаць вучняў. Мы кожны занятак пішам нешта новае. Хтосьці — аповед, бо санет яму нецікавы, нехта — акраверш. Узрост выхаванцаў — ад 7 да 17 гадоў, але мы ўсе сядзім за адным сталом. Я на дзяцей не цісну, бо ведаю, што такое творчая свабода. Да кожнага — індывідуальны падыход. Заняткі праходзяць весела: гадзіна — на разагрэў, мы можам піць чай, размаўляць, штосьці абмяркоўваць, згуляць у інтэлектуальную гульню. Але калі хто-небудзь хоча стварыць, ён прыходзіць і адразу піша, бо дома няма калі. Я ім даю магчымасць гэта рабіць на нашых занятках, каб яны па дарозе не страцілі той настрой, які тут зловяць.

Таццяна Дашкевіч упэўнена, што заўсёды трэба знайсці, за што дзіця пахваліць, таму што нельга падрэзаць крылы на ўзлёце. І толькі калі дзіця дазволіць да сябе наблізіцца, пачне вам давяраць, можна пачаць яго далікатна накіроўваць: «Мне важна, каб яно ўсё само зразумела і ўбачыла. Тэорыя ў нас, вядома, таксама даецца, але толькі ў гульнявой форме. Мы вучымся быць індывідуальнымі. У мяне кожнае дзіця ведае, што яно ўнікальнае і якія ў яго ёсць моцныя бакі».

### Важная «опцыя»

**Марыя БЯРШАРДСКАЯ, дзіцячы пісьменнік, сцэнарыст і настаўнік,** прыгадала, як у падлеткавым узросце пазнаёмілася праз сяброўку з паэтам і перакладчыкам Навумам Кіслікам.

— Мне было чатырнаццаць гадоў, ён мне даваў чытаць велізарную колькасць кніжак, якія ў тыя часы не выдаваліся. Я яму дэкламавала свае вершы, праўда, ён быў вельмі строгі крытык. Ніякіх сопляў з цукрам, ніякіх, — расказвае яна. — Але калі Навум сказаў пра адзін радок: «Ну, нічога так атрымалася», то я ішла дадому з пачуццём, што здарылася нешта неверагоднае. Потым я падрасла і трапіла ў «малую рэдкалегію» часопіса «Парус». З намі там па-даросламу размаўлялі. Абмяркоўвалі вынік — тое, што мы пішам, нашы артыкулы для часопіса, апавяданні або вершы. Але нас не вучылі пісаць, у сэнсе — ніякіх размоў пра тэорыю не было.

Чаму мяне навучыў Усерасійскі дзяржаўны інстытут кінематаграфіі? «Рабіць табурэтку!» Мне здаецца, што «рабіць табурэтку» трэба навучыць, таму што ў яе ёсць сядзенне і ёсць ножкі і яна не павінна падаць. Астатняму навучыць немагчыма. Ты або чуеш, што адбываецца вакол цябе, або не. Свет поўны цікавых гісторый і сюжэтаў, але іх трэба пачуць і разгледзець. Гэта кругласутачны працэс. Немагчыма працаваць пісьменнікам тры гадзіны ў дзень, а ў астатні час «выключацца». І калі ў цябе ёсць такая «опцыя», то будзе і вынік.

— Навучыць пісаць, вядома, нельга. Але мне, між іншым, вельмі не хапае гэтай самай «табурэткі», я ніколі не вучылася пісаць прафесійна, і мне вельмі хацелася б даведацца пра законы яе стварэння, таму што мяне часта заносіць, і табурэтка атрымліваецца нейкая крывая, — жартуе **настаўніца рускай мовы і літаратуры маскоўскай школы № 734 імя Аляксандра Тубельскага, дзіцячы пісьменнік Кацярына ЦІМАШПОЛЬСКАЯ**. — Я лічу, што адзіны спосаб адрадзіць цікавасць да літаратуры ў школе — пісаць разам з дзецьмі. Мы разам з вучнямі ствараем тэксты ў самых розных жанрах. У нас ёсць сшытак, які так і называецца «Сшытак для пісьменніцтва». Там ёсць белыя вершы, японскія хоку, школьныя аповесці, гумарэскі, анекдоты, увогуле, абсалютна ўсе тыя жанры, якія існуюць для пішучых людзей. Дзеці пішуць самі. Вядома, карава, і можа атрымацца не «табурэтка», а «гамак». Але часам атрымліваюцца проста фантастычна таленавітыя творы. І яшчэ, мне здаецца, важна, каб яны зразумелі, што быць Талстым — гэта не страшна. Што «Вайна і мір» абсалютна чытэльны твор, і яны самі могуць напісаць і выказаць нешта падобнае. Вялікія пісьменнікі, пра якіх мы столькі гадоў казалі, устаюць побач з дзецьмі. І апошнія разумеюць, што яны таксама нешта могуць.

**Ганна ГОЦІНА, вучаніца 9 класа сталічнай гімназіі № 24: «Тое, што я спасцігала праз мноства памылак, у «ЛІсЕ» мне растлумачылі даступнай чалавечай мовай».**

### Чаму не вучаць у школе?

**Пісьменнікі Яўгенія ПАСТЭРНАК і Андрэй ЖВАЛЕЎСКІ,** якія вядуць літаратурны практыкум для падлеткаў «ЛІсА»(было ўжо тры выпускі), пераканаліся, што самая вялікая цяжкасць для іх — завяршыць сваю працу. Усе прыходзяць з юнацкім запалам і гатовы весела бавіць час на занятках, але потым садзяцца пісаць і высвятляецца, што ўсё зусім не проста. «А гэта, аказваецца, так сумна і так доўга...» — скардзяцца яны.

— У школе можна напісаць сачыненне на каленцы, заўтра яго здаць і атрымаць адзнаку, можа, нават добрую, — разважае Яўгенія. — А ў нас даволі высокая планка, мы патрабуем на выхадзе аповед з завершаным сюжэтам і прымушаем перарабляць, калі ёсць праблемы з завязкай або кульмінацыяй. Пісаць падлеткі яшчэ гатовыя, а вось перапісваць — ужо не.

— Навучыць стварыць немагчыма, — кажа Андрэй. — Але можна дапамагчы асвоіць нейкія рэчы, якія ўсё роўна спатрэбяцца. Напрыклад, як дарабляць сваю работу да канца. Гэта рэдкае ўменне, якому ў школе не вучаць. Можна навучыць структураваць інфармацыю, разумець прычынна-выніковыя сувязі, псіхалогію людзей, можна падказаць, як выбудоўваць цікавы сюжэт, паказваць характар героя праз яго ўчынкі і словы. Як коратка, дакладна і сакавіта выкладаць свае думкі, пісаць без шаблонных фраз і штампаў. Мы можам дапамагчы знайсці свой стыль.

**Іван БАЧУК, дзевяцікласнік бараўлянскай сярэдняй школы № 2** — на курсах Яўгеніі і Андрэя «старажыл»:

— Першы раз я прыйшоў у «ЛІсУ», шчыра прызнаюся, не па сваёй волі, бо да канца не верыў, што ўвогуле змагу пісаць (мае школьныя сачыненні крытыкаваліся). Затым я пайшоў на другі курс, але самай прадуктыўнай для мяне аказалася трэцяя «ЛІсА». Уся тэорыя літаратуры была пададзена нам вельмі простай і зразумелай мовай. Я лічу, што, не маючы пэўнай базы, пісаць немагчыма. Як сказаў расійскі рэжысёр, які займаецца кароткаметражкамі, Мікіта Ардынскі, ВНУ забяспечыла яму добрую базу, хоць, канешне, без таленту, без унутраных памкненняў стаць рэжысёрам нельга. Тое ж, я лічу, датычыцца і літаратурнай творчасці. Абавязкова павінна быць база. А «ЛІсА» падарыла мне і базу, і вопыт.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Кастуся ДРОБАВА.**

*Погляд праз час*

# «ПАКЛОНІМСЯ ЗА ТОЙ ВЯЛІКІ БОЙ...»

## Чым жыве адзіны ў краіне маладзёжны патрыятычны цэнтр

**Доўгі час паўночна-заходняя частка Брэсцкай крэпасці была схаваная ад вачэй турыстаў і гараджан густым хмызняком. Летась месца ажыло і напоўнілася дзіцячымі галасамі: на базе адрэстаўраванага штаба 125-га стралковага палка пачаліся заняткі па патрыятычным выхаванні.**

На занятках у патрыятычным цэнтры.

### ТУТ НАВАТ СЦЕНЫ ВУЧАЦЬ

Гарнізонныя могілкі, мост камандзіра Шаблоўскага, Кобрынскае ўмацаванне — кожны крок на шляху да цэнтра знакавы.

— Думала пра гэта і брэсцкая моладзь, прапаноўваючы адкрыць адмысловы клуб патрыятычнага кірунку менавіта тут. Яны самі распрацавалі канцэпцыю, якую падтрымалі гарадскія ўлады і кіраўнік дзяржавы, — кажа **Алег КЛУНІН, намеснік дырэктара абласнога Цэнтра маладзёжнай творчасці,** філіялам якога і з'яўляецца вышэйназваная структура.

Двухпавярховы будынак не менш цікавы, чым шлях да яго. Узведзены ў 1930-я гады, ён першапачаткова быў штабам 30-га Палескага палка лёгкай артылерыі Войска Польскага. З 1939 года тут размясціўся 125-ы стралковы полк Чырвонай Арміі, якому было наканавана лёсам прыняць на сябе першы ўдар ворага ў ноч на 22 чэрвеня 1941-га. Пра гэта нагадваюць сляды ад куль і асколкаў на сценах. Падчас рэстаўрацыі іх спецыяльна вырашылі пакінуць у якасці нямога напаміну аб гераічным мінулым папярэдніх гаспадароў.

Увогуле, заняткі ў патрыятычным цэнтры ладзяцца па прынцыпе: менш агульных фраз і больш рэальных прыкладаў.

— З дзецьмі працуюць вопытныя і маладыя педагогі, якія «гараць» сваёй справай. Сярод іх — прадстаўнікі пошукавага руху, краязнаўцы, гістарычныя рэканструктары. Школьнікі і студэнты Брэста бясплатна могуць наведваць аб'яднанні па інтарэсах «Юны разведчык» і «Ваенная гісторыя», — расказвае Алег Аляксандравіч. — Тут вучаць выжыванню ў экстрэмальных умовах, асновам ваеннай археалогіі, арыентаванню на мясцовасці. Праводзяцца незвычайныя экскурсіі па мемарыяле, вывучэнне музейных экспанатаў і сустрэчы з пошукавікамі. Вядома, не абыходзіцца і без агульнафізічнай, агнявой, медыцынскай, тактычнай, страявой падрыхтовак. Асаблівы гонар цэнтра — пляцоўка для ваенна-тактычных гульняў. Дзяцей ад лазертага не адарваць!

Але самыя любімыя мерапрыемствы ў выхаванцаў — тыя, дзе яны могуць паказаць свае веды на практыцы. Самыя маленькія адпраўляюцца ў лясныя паходы і праходзяць квэсты на тэрыторыі крэпасці.

Самы маленькі выхаванец Ілья Мышленік атрымаў пазыўны «Камар».

Старэйшыя ўжо прымалі ўдзел у пошуках і перапахаваннях байцоў Вялікай Айчыннай.

— Акрамя заняткаў для мясцовых дзетак, мы можам арганізоўваць праграмы для школьнікаў і моладзі з усёй краіны. Тым больш што ў кожным рэгіёне ёсць патрыятычныя аб'яднанні, гурткі і класы з адпаведным кірункам. У цэнтры абсталяваны спальныя месцы і сталовая, дзе групы могуць спыняцца на некалькі дзён ці тыдняў. І тады знаёмства з Брэсцкай крэпасцю запомніцца не толькі класічнымі экскурсіямі, але і поўным пагружэннем у яе гісторыю і атмасферу, — дзеліцца Алег Клунін.

### ПРА «ВАЙНУШКІ» І ВАЙНУ

Яшчэ два-тры дзесяцігоддзі таму пытанне патрыятычнага выхавання моладзі стаяла зусім пад іншым вуглом. Перад вачыма хлопчыкаў і дзяўчынак былі іх родныя дзядулі і бабулі — жывыя сведкі самай страшнай трагедыі за ўсю гісторыю чалавецтва. Яны з'яўляліся бясспрэчным аўтарытэтам і ўзорам сапраўднай мужнасці. Сёння, калі ад нас сыходзяць апошнія ветэраны, паўстае заканамернае пытанне — а што далей? На чым павінен грунтавацца патрыятызм падрастаючага пакалення? «Адзін са складнікаў — памяць аб подзвігах нашага народа», — упэўнены ў патрыятычным цэнтры.

Супрацоўнікі адзначаюць, што некаторыя дзеці, прыходзячы да іх упершыню, вайну ўспрымаюць як маляўнічае шоу. Што да гэтага прывяло? Камп'ютарныя гульні па матывах рэальных баявых дзеянняў ды фільмы, дзе акцэнт робіцца на крутасці героя, а не на яго добрых памкненнях. Пад такім уплывам сапраўдныя подзвігі абясцэньваюцца. Хлопчыкі і дзяўчынкі, якія прызвычаіліся «страляць» камп'ютарнай мышкай, седзячы ў цёплым пакоі, не разумеюць, што вайна — гэта холад і голад, боль і слёзы, смерць. На думку педагогаў цэнтра, прабелы ў патрыятычным выхаванні ў тым ліку прыводзяць і да трагедый з удзелам падлеткаў. Яны бяруць у рукі нажы, пілы, зброю, не разумеючы рэальных наступстваў сваіх дзеянняў. Для іх гэта проста працяг «гульні»...

### ПРА ДОЎГ І ПАМЯЦЬ

Напрыканцы студзеня патрыятычны цэнтр сумесна з Брэсцкім абласным камітэтам БРСМ запусціў акцыю, прымеркаваную да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ідэя простая: добраўпарадкаванне ветэранскіх магіл, якія з розных прычын засталіся без нагляду. У чалавека магло не застацца сваякоў ці яны пераехалі ў іншае месца. Але бываюць і выпадкі, калі дзеці і ўнукі ветэранаў проста не жадаюць гэтым займацца.

Арганізатары праекта «Доўг і памяць» акцэнтуюць: мэта — прыцягнуць увагу менавіта да пахаванняў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, якія памерлі ўжо пасля яе заканчэння. Па заканадаўстве, магілы загінулых падчас ваенных дзеянняў на фронце або памерлых у шпіталях знаходзяцца пад аховай дзяржавы. Калі ж баец пражыў вайну, то ў яго магіла — «цывільная», будзь ён нават Героем Савецкага Саюза. Пэўны час без догляду (здараецца, што сваякоў няма) — і пахаванне пачынае лічыцца аварыйным, помнік падлягае зносу.

— Добраўпарадкаванне магіл — гэта самае простае, што можа зрабіць кожны з нас. Разам з тым нам хацелася б, каб удзельнікі акцыі паспрабавалі пазнаёміцца з лёсамі байцоў Вялікай Айчыннай вайны. Першая частка праекта скіраваная на пошук інфармацыі, апісанне месцаў пахавання. Адна справа — вывучаць гісторыю па сухіх лічбах і датах у вучэбных дапаможніках, зусім іншая — даведацца пра лёсы слаўных сыноў і дачок свайго горада ці вёскі. У Год малой радзімы гэта надзвычай актуальна, — кажа Алег Клунін.

Неабходнасць праекта выспявала даўно. Па-першае, камунальныя службы ўсё часцей раўняюць з зямлёй «закінутыя» пахаванні на могілках. Прэтэнзій да іх быць не можа — такі парадак прадугледжаны заканадаўствам. Але тут ужо пытанне да нас самі: ці заслугоўваюць людзі, якія ваявалі за нашу зямлю, такога стаўлення? Па-другое, у многіх вёсках і гарадах падобныя акцыі па добраўпарадкаванні магіл ветэранаў праводзяцца даўно: настаўнікамі разам з вучнямі, краязнаўцамі, актывістамі БРСМ і проста неабыякавымі людзьмі. Цяпер у валанцёраў на месцах ёсць не толькі магчымасць рабіць тое, што рабілі дагэтуль, але яшчэ і пазнаёміцца з аднадумцамі і заручыцца падтрымкай.

**Ганна КУРАК.**

*Мінск — Брэст — Мінск.*

*Да службы — гатовы!*

# Адчулі сябе ратавальнікамі...

**«Адзін дзень з МНС». Так называўся вучэбна-метадычны збор, які на базе пажарнай аварыйна-выратавальнай часці № 10 Заслаўя правялі Мінская абласная арганізацыя БРСМ сумесна з Мінскім абласным упраўленнем МНС. Байцы маладзёжных атрадаў аховы правапарадку (МААП) цэнтральнага рэгіёна прайшлі тут своеасаблівы тэст-драйв і на адзін дзень сталі ратавальнікамі. Мерапрыемства прайшло напярэдадні святкавання 15-годдзя руху БРСМ МААП.**

Надзяванне баявога адзення, збор і выезд па сігнале «трывога»... Алгарытмы гэтых працэсаў удзельнікам тэст-драйва неабходна было засвоіць вельмі хутка, бо ў выпадку паступлення паведамлення аб пажары ці іншай надзвычайнай сітуацыі хлопцам разам з ратавальнікамі неадкладна трэба было выехаць на месца здарэння. Байцам МААП была дадзена магчымасць праявіць сябе пры ліквідацыі чыгуначнай аварыі з разлівам нафты і нафтапрадуктаў.

Удзельнікаў збору азнаёмілі з тэхнічнымі характарыстыкамі, магчымасцямі тэхнікі і абсталявання ратавальнікаў. Акрамя таго, ім неабходна было выканаць баявое разгортванне і падаць рэчыва для тушэння, падняцца ў акно трэцяга паверха вучэбнай вежы. Адно з самых складаных выпрабаванняў — праходжанне агнявой паласы.

Арганізатары ўпэўнены, што «Адзін дзень з МНС» дапаможа байцам МААП цалкам акунуцца ў атмасферу паўнавартаснага дня ратавальніка, а набытыя навыкі дапамогуць маладым праваахоўнікам Міншчыны не разгубіцца ў любой надзвычайнай сітуацыі і аказаць прафесійную дапамогу тым, хто трапіў у бяду.

У Мінскай вобласці рух МААП аб'ядноўвае 2368 юнакоў і дзяўчат у 85 атрадах.

# ...і будучымі салдатамі

**Абласныя зборы «Прызыўнік-2019» адбыліся нядаўна ў Брэсце на базе вайсковай часці 92616 — 38-й асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой Венскай Чырванасцяжнай брыгады.**

У рамках рэспубліканскай акцыі «Я — служу!» Брэсцкая абласная арганізацыя БРСМ і абласны ваенны камісарыят запрасілі на іх будучых — больш за сто ўдзельнікаў — і цяперашніх салдат.

Моладзь змагла азнаёміцца з традыцыямі часці, распарадкам дня, бытам і асноўнымі вучэбнымі заняткамі сучасных воінаў-дэсантнікаў. Хлопцы паўдзельнічалі ў розных спаборніцтвах: паспрабавалі злажыць парашут, сабраць-разабраць аўтамат, на час надзець сродкі хімаховы. Салдаты, у сваю чаргу, правялі майстар-класы па падшываннi каўнерыка, чыстцы абутку і іншых прамудрасцях армейскага быту.

Фінальным акордам праекта стала канцэртная праграма з уручэннем падзячных лістоў бацькам, узнагароджаннем самых актыўных прызыўнікоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
21 02 2019 г.

На сваім месцы

# Простая формула настаўніцкага шчасця

**...«Хадземце, у нас ёсць паўгадзіны, пасля пабягу на ўрок працы ў восьмым класе», — з усмешкай сустракае мяне Аляксей МАКЕЕЎ. Педагогам-арганізатарам у гімназіі гарпасёлка Акцябрскі, што на Гомельшчыне, ён працуе другі год. Месца размеркавання малады спецыяліст успрыняў з аптымізмам, з асаблівасцямі навучання асвоіўся хутка. «Якая розніца, дзе станавіцца прафесіяналам? Усюды патрэбны добрыя людзі», — дадае суразмоўнік.**

Сам хлопец з вёскі Глазаўка Буда-Кашалёўскага раёна. Вывучыўся на сувязіста ў Гомельскім прафесіянальна-тэхнічным вучылішчы, пасля — на настаўніка ў Мазырскім педагагічным універсітэце імя Шамякіна. Спецыяльнасць абраў сур'ёзную — «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны».

— Па заканчэнні вучобы ўсім студэнтам паведамілі, куды іх размяркуюць. Мне сказалі: «Едзеш у Акцябрскі», я адказаў: «З радасцю!» Гісторыкаў у раёне хапала, а вось педагогі-арганізатары былі ў дэфіцыце. Мяне не спалохала змена дзейнасці, я лёгкі на пад'ём. Да таго ж са школьных гадоў часта ўдзельнічаў у розных конкурсах, арганізоўваў мерапрыемствы, выступаў на сцэне. Таму было цікава: ці змагу здзівіць вучняў сваімі ідэямі, ці спадабаюцца яны калегам-настаўнікам?

Рабочы дзень Аляксея пачынаецца ў 8 гадзін раніцы і заканчваецца ў 8 вечара. У абавязкі маладога спецыяліста ўваходзіць як арганізацыйная дзейнасць, так і правядзенне ўрокаў, спартыўных секцый. Вольнага часу застаецца няшмат, але педагога гэта не бянтэжыць:

— У школе мяне называюць актывістам, здзіўляюцца, як я ўсё паспяваю. А мне падабаецца нешта прыдумляць для дзяцей, займацца разам спортам. Калі я толькі прыехаў у раён, арганізаваў школьную суполку па інтарэсах «Што? Дзе? Калі?», летась на спаборніцтвах мы атрымалі ў Гомелі дыплом другой ступені. Да таго ж я з'яўляюся першым сакратаром пярвічнай арганізацыі БРСМ. Лічу, што гэтым паказваю добры прыклад моладзі. У найбліжэйшых планах — стварыць для школьнікаў гурток тэатральнага майстэрства. Мяне гэта ідэя вельмі захапляе.

Яшчэ падчас знаёмства з Аляксеем было бачна, што выглядае ён маладзей за свой узрост.

— Ці былі выпадкі, калі школьнікі прымалі вас за «свайго», звярталіся не на «вы»?

— Так. Дарэчы, у маёй сям'і ўсе выглядаюць значна маладзейшымі, чым ёсць на самай справе. Таму, калі толькі прыйшоў у гімназію, чуў у дачыненні да сябе ад школьнікаў «ты». Але я заўсёды прадстаўляўся, і размова пачыналася ў іншым рэчышчы. Я на дзяцей не крыўджуся.

Суразмоўнік прызнаецца, што часам яму не хапае настойлівасці. Напрыклад, калі трэба ўгаворваць вучняў пайсці на нейкае мерапрыемства ў пазашкольныя гадзіны. Не ўмее і хваліць сябе, да работы ставіцца крытычна: аналізуе, што атрымалася, што не, перажывае, па магчымасці намагаецца перарабіць тое, што лічыць не ідэальным.

Дарэчы, сваю малую радзіму — Глазаўку — педагог наведвае не часта. «Бацькі нават жартуюць, што калі я і ажанюся, то толькі са сваёй прафесіяй». Настаўнік дзеліцца, што самае складанае ў яго працы — уставаць рана, а самае прыемнае — узаемадзейнічаць з людзьмі. У свабодныя гадзіны ён іграе на гітары, удзельнічае ў фальклорным народным ансамблі, перамагае ў рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах.

— Нядаўна прымаў удзел у беларуска-расійскім «Мы адзіныя». Трэба было размясціць у сацсетцы фотаздымак з месцам, з якім звязаныя цёплыя ўспаміны. Я абраў сваё любімае — бераг Прыпяці. Калі даведаўся, што менавіта гэтае фота набрала найбольшую колькасць «лайкаў» і я пераможца, — здзівіўся. Але было прыемна.

Цікава даведацца, што на пачатку адпрацоўкі Аляксей быў упэўнены: пасля яе заканчэння адразу звольніцца і паедзе ў іншы горад. Але цяпер у яго іншае меркаванне:

— Працаваць у гарпасёлку — гэта крута! Добры калектыў, добрыя дзеці... Што яшчэ для шчасця трэба? Адзіны мінус: мала забаў, даводзіцца самому нешта прыдумляць. Мне камфортна тут жыць, бо ў вёсцы вельмі спакойна, а ў сталіцы — шумна. Не месца ўпрыгожвае чалавека, а чалавек месца.

**Дар'я ШЛАПАКОВА,**
**студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**
*Мінск — Акцябрскі — Мінск.*

# ГАЮЧАЯ МОЦ РОДНАГА СЛОВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Хапае на гэта часу? — пытаюся. — Бо, як мне падаецца, хвілін на прыём аднаго пацыента адведзена мала.

— Лепш да мяне трапіць менш хворых, але яны атрымаюць якаснае лячэнне. Астатнія прыйдуць у іншыя дні. Прымаць дзеля «птушачкі» я не буду, — тлумачыць хірург.

**«Неабходна разумець, што чалавек сам нясе адказнасць за сваё здароўе. Ад нас, медыкаў, тут залежыць толькі пяць працэнтаў».**

Ён працуе ў дзве змены. Першая — з 8 гадзін раніцы да 14 — прыём пацыентаў. Пасля абеду хірург наведвае хворых па месцы жыхарства, афармляе рабочую дакументацыю. Другая — з 14 да 20 гадзін. Падчас яе раніца таксама занятая справамі паліклінікі. Выхадныя дні — нядзеля і тры суботы. Адна субота на месяц — дзяжурства. «Я жыву побач, таму мяне такі графік задавальняе».

— Спачатку хваляваўся, што калі прыйду працаваць у паліклініку, то не буду развівацца як спецыяліст. Памыляўся, — прызнаецца Дзмітрый. — Тут шмат магчымасцяў расці прафесійна. Загадчыца аддзялення, дарэчы, з'яўляецца маім «мясцовым настаўнікам». Увогуле, старэйшыя калегі заўсёды гатовы дапамагчы наваспечанаму спецыялісту.

Інтэрнатуру Дзмітрый праходзіў таксама на базе гэтай паліклінікі. За год, як прызнаецца хлопец, ён зразумеў, што «больш за ўсё маладому ўрачу не хапае практыкі».

## «Важна, што ты гаворыш і як ставішся да пацыентаў»

— Як наведвальнікі рэагуюць на тое, што іх будзе лячыць малады ўрач? — цікаўлюся. — Гаворка ж ідзе пра здароўе, а часам і пра жыццё...

— Дастаткова крыху адпусціць бараду — і табе ўжо не 25, а 29—30 гадоў, — жартуе Дзмітрый. — Плюс першая змена заўсёды даяе ўзросту: не выспаўся, сінякі пад вачыма. Насамрэч такое пытанне ўзнікае рэдка. Людзям важна, што ты гаворыш і як да іх ставішся. Усё астатняе — дробязі.

На пытанне пра зарплату маладога спецыяліста Дзмітрый, як і на працягу ўсёй нашай гутаркі, адказвае з гумарам:

— Пры нашым фінансаванні аховы здароўя я не магу разлічваць на большае. Таму на цяперашні момант мяне ўсё задавальняе. Сысці працаваць у прыватны цэнтр, дзе, як кажуць, плацяць больш, змагу толькі пасля атрымання першай ці вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі. Такія правілы. Наступныя дзесяць гадоў дакладна нікуды не збіраюся.

Малады хірург не да канца разумее шматлікія і вечныя нападкі пацыентаў наконт работы дзяржаўных устаноў аховы здароўя:

— Калі ў вас ёсць магчымасць параўнаць з медыцынай у іншых краінах, тады прэтэнзій быць не павінна. У Германіі, напрыклад, да вузкага спецыяліста трапіць амаль немагчыма: недахоп кадраў. Запіс ідзе на паўгода наперад.

## «Рацыяналізацыя часу, работа ў камандзе і давер»

— Як вы лічыце, чаму Зямля круціцца, а людзі з яе не падаюць?! Таму што яны прымацаваныя да паліклінікі! — жартуе Дзмітрый. — Здароўе — гэта інвестыцыі. І перш за ўсё не фінансавыя, а ментальныя. Неабходна разумець, што чалавек сам нясе адказнасць за сваё здароўе. Ад нас, медыкаў, тут залежыць толькі пяць працэнтаў. Усё астатняе — гэта як паводзяць сябе людзі, як харчуюцца, як мысляць і, канешне ж, генетыка.

**Медыкаў у сям'і Дзмітрыя няма. Ён кажа, што прафесія заўсёды прыцягвала магчымасцю дапамагаць.**

Дзмітрый кажа, што па статыстыцы мы, на жаль, сталі менш рухацца.

— Я, напрыклад, бегаю. А яшчэ танцую. Кірунак — вог. Дагэтуль танцаваў у ансамблі народнага танца «Чабарок». Але зараз мяне цікавіць менавіта пластыка. Увогуле танец — гэта цудоўная магчымасць падтрымаць суставы і мышцы ў добрым стане, своеасаблівая прафілактыка хвароб Альцгеймера і Паркінсона, — расказвае Дзмітрый.

Час ад часу суразмоўнік яшчэ і спявае, іграе на гітары, фартэпіяна. На канцэрце да Дня маці, які зладзілі супрацоўнікі паліклінікі, ён «прымусіў» заспяваць і сваіх калег:

— Мы выконвалі «Купалінку». Усім спадабалася. Канешне, нехта саромеўся. Але, як казала мая бабуля, калі ты спяваеш у хоры, цябе не так чутна і ад гэтага не так страшна. Дарэчы, ігра на музычных інструментах станоўча ўплывае на маторыку пальцаў падчас правядзення аперацый.

Хлопец выдатна ведае англійскую мову. Падчас Параалімпійскіх гульняў у Сочы працаваў медыцынскім перакладчыкам. Зараз вучыць нямецкую, у планах — французская.

Дзмітрый з'яўляецца паслом еўрапейскай моладзі ў Беларусі ў праекце Усходняга партнёрства, распавядае аб адукацыйных і навуковых магчымасцях для яе ў нашай краіне. А яшчэ ён нацыянальны каардынатар маладзёжнай сеткі «роўнага навучання» Y-PEER у Беларусі. Гэта глабальная ініцыятыва ў навучанні па пытаннях сексуальнага выхавання і рэпрадуктыўнага здароўя моладзі, заснаваная на прынцыпе «роўны навучае роўнага». Y-PEER дзейнічае больш чым у 40 краінах свету, у Беларусі яна прадстаўленая 60 валанцёрамі. Трэнінгі праводзяцца ў школах, ліцэях, універсітэтах.

На пытанне, як ён усё паспявае, Дзмітрый усміхаецца:

— Рацыяналізацыя часу, работа ў камандзе і давер. Не трэба ўсё браць на сябе. Дзяліцеся абавязкамі з іншымі.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# «ПРЫРУЧЫЦЬ» ЦЭГЛУ І ГЛІНУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Нерэальна зрабіць больш за 15 аб'ектаў за сезон, вы проста не вытрымаеце. Летась у мяне была печка за печкай, адну заканчваў, адразу ехаў класці другую, сям'ю практычна не бачыў. Дзякуй жонцы Надзеі, якая церпіць мае раз'езды і выхоўвае дзяцей, — усміхаецца. — Калі б не было разумення з яе боку, магчыма, мне б давялося кінуць любімую справу.

Сезон у печнікоў цягнецца з красавіка да канца лістапада. У астатні час з-за халадоў класці печ няма сэнсу — яна проста не высахне і не ўстаіцца. На канструкцыі прасцейшыя ў майстра ідзе чатыры дні, на складаныя — 10—12 дзён. «Вось тут з прамавугольнай цэглы тачылася круглая, потым шліфавалася ўсё ўручную. Таму і часу пайшло шмат», — паказвае Арцём на фота адну са сваіх работ.

У яго альбоме некалькі дзясяткаў здымкаў. «Гэта я яшчэ даўно не абнаўляў, — заўважае суразмоўнік і паказвае чарговую печ. — Яна каштавала 5,5 тысячы еўра, практычна як машына. Мы рабілі яе ўдвух з братам сем дзён. Я пахудзеў за гэты час на 11 кілаграмаў! Амаль уначы прыязджаў дадому, клаўся спаць, а ў тры раніцы ўжо прачынаўся, бо ў галаве далей «складваліся» рады».

Якія печы найбольш папулярныя? Майстар кажа, што попытам карыстаецца ўсё: і каміны, і барбекю. У модзе таксама камінапеч Кузняцова.

— А гадоў дзесяць таму заказчыкам было без розніцы — толькі б яна грэла. Раней цагліны прадавалі крывыя, складаны дызайн рэалізаваць не атрымалася б, — тлумачыць мужчына.

Дарэчы, пра заказчыкаў. Сярод іх ёсць і звычайныя вясковыя бабулі (Арцём згадвае часы, калі яму прапаноўвалі заплаціць за працу бульбай), і заможныя людзі. Колькі будзе каштаваць печ, залежыць ад складанасці работы і матэрыялаў. Напрыклад, латвійская цэгла прадаецца па 1,5 еўра за штуку, а віцебская — па 60 капеек. Багатым кліентам, праўда, цана не важная, для іх галоўнае — увасобіць у жыццё сваю мару.

— Усе заказы незвычайныя, — кажа Арцём. — Работа творчая, пастаянна чамусьці даводзіцца вучыцца.

Жартуе, што рамантыкі ў гэтай прафесіі няма. Спіш, дзе даводзіцца, ясі, што знойдзеш. Аднойчы ехаў да кліента ў вёску, той запэўніў: наконт ежы можаце не клапаціцца, у мяне ўсё ёсць. А насамрэч быў склад тушонкі. Шэсць дзён толькі ёй і харчаваліся. Арцём смяецца, што пасля на гэтыя бляшанкі глядзець не мог.

Самы складаны этап у рабоце — роўна выкласці першы рад, а далей ужо працэс сам пойдзе. У камп'ютарнай праграме можна дакладна разлічыць, колькі цаглінак спатрэбіцца на печ — плюс-мінус 10 штук. Хоць айчынныя часам даводзіцца браць з запасам у 20—30 працэнтаў — партыі могуць значна адрознівацца па характарыстыках. Наогул многае з матэрыялаў прывозіцца з Расіі ці Еўропы.

— Узяць літыя дзверцы. У нас як выраблялі іх ва ўмоўным 1963 годзе, так і цяпер працягваюць. Так, яны добрыя, роўныя. Але асартымент вельмі маленькі. Заказчыкам хочацца дзверцы са шклом, рознымі ўзорамі, а ў нас гэтага няма.

Колькі печ можа праслужыць? Арцём называе тэрмін эксплуатацыі — 50—60 гадоў.

— Лепш за ўсё, вядома, карыстацца печчу штодзень. Калі яна на лецішчы і паліцца рэдка, гэта не так добра. Мы за 30 гадоў рабілі капрамонт сваёй тры разы: «выграбалі топку» і нанова яе збіралі, — дзеліцца майстра. — Вось нядаўна ў заказчыкаў быў: дзеці фактычна сапсавалі печ. У сына быў дзень нараджэння, яны паехалі кампаніяй на лецішча, напіхалі поўную топку дроў. Не ведалі, што халодную печ трэба паступова праграваць, каб яна расшырылася. А канструкцыю «расцягнула» ад гэтага ўсплёску энергіі, і пайшоў агонь. Добра, яшчэ своечасова заўважылі.

На заказ мужчына выязджае з поўнай машынай інструментаў: балгаркі, дыскі, паліроўкі, дрылі, насадкі, пілы... І заўсёды працуе з памочнікам. «Калі людзі чуюць, што падсобнаму рабочаму плацяць 50 долараў у дзень, не разумеюць, за што так многа. Але ж гэта цяжкая праца: пясок сеяць, цэглу насіць, раствор замешваць. Калі заказчык дужы, ён можа і сам дапамагаць».

Арцём дзеліцца назіраннямі: класці печы часта бяруцца муляры. У іх атрымліваецца ідэальная кладка — рука ж на будоўлі набіта. Але што павінна быць унутры, муляр не заўсёды разумее, таму, бывае, печ складзена цудоўна, а не дзейнічае.

Мінусы прафесіі? Майстар уздыхае: ні на што іншае часу не застаецца. Раней ёй быў заядлым рыбаком. Ёсць і лодкі, і матор, і спінінгі, але ўжо два гады не да гэтага.

— Калі хочаш заставацца запатрабаваным, трэба шмат працаваць. Тут не ў грашах справа, прагі нажывы ў мяне няма — людзі чакаюць. Альбо ты бярэшся, альбо знойдуць іншага, — тлумачыць суразмоўнік.

— Не хацелася змяніць усё на ўтульнае крэсла ў офісе?

— Офіс я не пераношу, мне патрэбна свабода. Ды і з маёй работай лёгка трымаць сябе ў форме, — усміхаецца мужчына.

Дзеці яго яшчэ малыя: сыну чатыры гады, дачцэ — дзевяць.

— Ці хачу, каб нашчадак працягнуў справу? Складанае пытанне. Нас бацька не прымушаў. Да гэта трэба прыйсці, работа павінна табе падабацца.

Майстар упэўнены, што, калі ўкладаць душу, прыбытак будзе ў любой справе. «Але печнікам трэба гадоў дзесяць папрацаваць, каб асвоіць прафесію як след. Не чакайце, што толькі скончыце курсы, і адразу пасыплюцца «бабкі». Усё прыходзіць з вопытам».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*Ідэі маладых*

# Не прамаргаць інфармацыю

**Дзевятнаццацігадовы Ілья АРХІПАЎ прыдумаў мабільную праграму, якую прызналі адной з найлепшых у краіне сярод маладзёжных распрацовак: 4Read дазваляе чытаць у два разы хутчэй.**

— Ідэя з'явілася даўно, бо тэмай хуткачытання я цікавіўся перш за ўсё для сябе. Вывучаў артыкулы, разглядаў і параўноўваў розныя метады, — расказвае чацвёртакурснік Столінскага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа. — Звычайнае чытанне прадугледжвае пераход ад слова да слова, мы вымушаны «рухаць вачамі» па старонцы. Гэта адбірае час. Прынцып 4Read заснаваны на тэхналогіі RSVP (ад англійскага Rapid serial visual presentation — хуткае паслядоўнае візуальнае прад'яўленне). Працуе яно так: словы выводзяцца па адным у фіксаванай вобласці экрана. Чытачам не трэба карыстацца перыферыйным зрокам, за кошт гэтага і павышаецца хуткасць успрымання тэксту.

Праграму малады столінец напісаў літаральна за два тыдні. III Рэспубліканскі конкурс маладзёжных праектаў «Інфармацыйныя і мабільныя тэхналогіі для адукацыйнага працэсу» стаў для Ілы добрай матывацыяй.

— Дагэтуль была толькі задумка, а тут нарэшце з'явілася нагода яе рэалізаваць. Прызнацца, я не чакаў, што стану адным з пераможцаў. З усёй краіны з'ехалася столькі таленавітых хлопцаў і дзяўчат, у многіх былі неверагодна крутыя праекты! Мая праграма досыць простая, хоць і насамрэч карысная. Спампаваць яе можа любы ахвотны абсалютна бясплатна.

Калі параўноўваць «тэхналагічны» метад хуткачытання са звычайнымі курсамі, адразу становяцца відавочнымі перавагі першага.

«Класічныя» заняткі ў сталіцы каштуюць у сярэднім каля 250 рублёў. Каб засвоіць методыку, спатрэбіцца не менш за два месяцы. На занятках будуць вучыць прынцыпам вертыкальнага чытання, а пры ім значна губляецца разуменне тэксту. У мабільнай праграмы такіх недахопаў няма. Тэхналогія RSVP падыходзіць людзям з парушэннямі зроку і вокарухальнай актыўнасці. Вучоныя нават даказалі яе карысць пры лячэнні дыслексіі.

4Read зручная тым, што ўстанавіць яе можна на розныя аперацыйныя сістэмы (Linux, Windows, Android). Памер экрана пры гэтым можа быць любы — ад манітора камп'ютара да смартфонаў і нават разумных гадзіннікаў.

— Аднак працаваць яшчэ ёсць над чым. У планах дадаць у праграму функцыю распазнавання маргання, каб выключыць магчымасць пропуску інфармацыі, калі заплюшчваеш вочы, — дзеліцца Ілья. — Сёння вельмі складана стварыць нешта новае. Бывае, прыдумаеш ідэю, напішаш код. Пасля пачынаеш шукаць у інтэрнэце штосьці падобнае і разумееш, што да цябе гэта ўжо дзясяткі людзей па ўсім свеце зрабілі. Але гэта не азначае, што не трэба спрабаваць. Зараз я распрацоўваю ўласны месенджар. Іх існуе вялікая колькасць, аднак хочацца стварыць нешта сваё, зразумець, што і як там павінна працаваць.

Свае веды і навыкі хлопец пастаянна імкнецца прымяніць у справе. На вытворчай практыцы ён напісаў праграму для ўліку электраэнергіі ў мясцовай ЖКГ.

— Калі шчыра, справаздача далася мне складаней, чым код, — з усмешкай зазначае праграміст.

Планы на будучыню Ілья пакуль не будуе:

— Сфера IT пастаянна развіваецца і змяняецца. Калі я выпушчуся з каледжа, могуць з'явіцца новыя кірункі. Адзінае, у чым упэўнены: буду пісаць праграмы на мове C++. Пасля заканчэння вучобы трэба будзе думаць і пра пераезд у сталіцу ці абласны цэнтр, бо спецыялісту-пачаткоўцу неабходна вучыцца працаваць у камандзе, пераймаць досвед старэйшых калег. Толькі вопытныя праграмісты могуць дазволіць сабе «хадзіць на работу», не выходзячы з дому.

**Ганна КУРАК.**

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ на строительство Объекта

«Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными объектами торгово-общественного назначения по ул. Купревича»

**ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ**

**Застройщик:** ОАО «Минский домостроительный комбинат» зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей решением Мингорисполкома 14 февраля 2001 г. за № 100258980.

**Юридический (почтовый) адрес:** 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43, телефоны для справок: (017) 2072060, +375 (44) 7771158;

Режим работы для приема заявлений и заключения договоров: понедельник — четверг — 8.15 — 16.30, обед — 12.00 — 12.45, пятница — 8.15 — 15.00, обед — 12.00 — 12.45.

В течение трех предшествующих лет ОАО «Минский домостроительный комбинат» в качестве Застройщика (заказчика) построены следующие объекты:

«16-этажный жилой дом по генплану № 12 в микрорайоне № 2 в границах улиц Шаранговича-Горецкого-Рафиева», ноябрь 2013 г. – август 2015 г.,

«Многоквартирный жилой дом со встроенными административными помещениями по генплану № 13 в микрорайоне № 2 реконструируемой застройки в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая дер. Сухарево)», ноябрь 2014 г. — июнь 2016 г.,

«Реконструкция застройки территории в районе улиц Михалова, Алибегова. Жилой дом № 13», апрель 2017 г — апрель 2018 г.;

**ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА**

Заключение государственной экспертизы (положительное): РУП «Главгосстройэкспертиза» № 147-15/17 от 29.04.2017 г.

Свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации земельного участка от 08.02.2018 г. № 500/1719-2762.

Получено разрешение Инспекции Госстройнадзора по г. Минску № 2-206Ж-037/17 от 28.12.2017 года на производство строительно-монтажных работ.

Заказчиком и генеральным подрядчиком по строительству объекта выступает ОАО «Минский домостроительный комбинат».

Начало строительства – декабрь 2017 г. Предполагаемый Заказчиком срок приемки объекта в эксплуатацию – декабрь 2019 года.

Участок под строительство граничит с севера со свободной от застройки озелененной территорией, с востока и с юга – с существующей застройкой (жилой 19-этажный дом и детский садик/начальная школа № 1) и с запада – ул. Академика Купревича.

Проектом предусмотрено размещение**:**

**— многоквартирного 16-этажного жилого дома на 235 квартир.**

Многоквартирный жилой дом состоит из трех 16-этажных секций, с техническим подпольем и техническим этажом. Высота жилого этажа от пола до пола составляет 3,0 м, в чистоте — 2,75 м. Конструктивная схема здания многоквартирного жилого дома — сборно-монолитный безригельный каркас «КУБ». Наружные стены здания запроектированы из керамзитобетонных блоков толщиной 400 мм, межквартирные перегородки запроектированы сдвоенными кирпичными с воздушным зазором. Между квартирами и внеквартирными коридорами предусмотрены керамзитобетонные перегородки толщиной 200 мм. Перегородки санузлов — кирпичные толщиной 120 мм.

Перекрытия — сборные железобетонные плиты толщиной 180 мм.

Количество квартир в доме — 235 шт., из которых 61 шт. — однокомнатные, 80 шт. — двухкомнатные, 92 шт. — трехкомнатные, 2 шт. —четырехкомнатные.

На типовом этаже запроектированы квартиры состава 2-2-3-3 в 1 секции, 2-1-1-3-1-1-3 во 2-й секции, 2-2-3-3 в 3-й секции.

Проектом предусматривается свободная планировка квартир, за исключением ванных, туалетов и ниш инженерного оборудования. Устройство внутриквартирных перегородок, установка межкомнатных дверей, внутренняя чистовая отделка квартир не выполняются.

Все квартиры оборудованы остекленными лоджиями. Высота ограждения лоджий — 1100 мм. Остекление лоджий предусмотрено распашным из алюминиевого профиля. Окна — из профиля ПВХ. Входные двери — металлические.

Наружная отделка стен — окраска фасадной краской.

Проектом предусматривается размещение в каждой секции двух пассажирских лифтов грузоподъемностью 1000 и 400 кг, со скоростью 1 м/с.

Жилой дом не оборудован мусоропроводами и мусоросборными камерами. Мусороудаление будет осуществляться на площадку для мусоросборных контейнеров для раздельного сбора мусора с ограждением из облегченных металлоконструкций. Вся территория в границах отвода участка благоустраивается и озеленяется.

**— двухэтажной четырехуровневой гараж-стоянки открытого типа на 191 машино-место.**

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые, вентиляционные и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их жизнедеятельностью.

Строительство Объекта будет осуществляться в соответствии с заключенными договорами создания объектов долевого строительства (далее — договоры). Предметом договора будет являться строительство жилого помещения и машино-места в гараже-стоянке (паркинге).

Гражданам для заключения договоров предлагается **95** квартир и 95 машино/мест, из них:

**12** однокомнатных квартир, общей площадью от 43,72 до 44,25 м.$^2$ Стоимость строительства 1 м$^2$ общей площади квартиры с открытым м/местом– 1190 долларов США, с крытым м/местом — 1215 долларов США;

**6** однокомнатных квартир, общей площадью от 48,24 до 48,43 м$^2$. Стоимость строительства 1 м$^2$ общей площади квартиры с открытым м/местом– 1175 доллара США, с крытым м/местом — 1200 долларов США;

**7** однокомнатных квартир, общей площадью от 50,53 до 50,62 м$^2$. Стоимость строительства 1 м$^2$ общей площади квартиры с открытым м/местом– 1175 доллара США, с крытым м/местом — 1200 долларов США;

**4** двухкомнатные квартиры, общей площадью от 57,16 до 57,49 м$^2$. Стоимость строительства 1 м$^2$ общей площади квартиры с открытым м/местом– 1190 долларов США, с крытым м/местом — 1215 долларов США;

**30** двухкомнатных квартир, общей площадью от 63,32 до 63,94 м$^2$. Стоимость строительства 1 м$^2$ общей площади квартиры с открытым м/местом– 1160 долларов США, с крытым м/местом — 1180 долларов США;

**30** трехкомнатных квартир, общей площадью от 80,43 до 82,87 м$^2$. Стоимость строительства 1 м$^2$ общей площади квартиры с открытым м/местом– 1100 долларов США, с крытым м/местом — 1120 долларов США;

**5** трехкомнатных квартир, общей площадью от 92,72 до 93,89 м$^2$. Стоимость строительства 1 м$^2$ общей площади квартиры с открытым м/местом– 1100 долларов США, с крытым м/местом — 1120 долларов США;

**1** четырехкомнатная квартира (1 этаж), общей площадью 104,99 м$^2$. Стоимость строительства 1 м$^2$ общей площади квартиры с открытым м/местом — 960 долларов США, с крытым м/местом — 980 долларов США.

Окончательная цена объекта долевого строительства определяется в договоре с учетом поэтажного расположения квартир.

Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к соответствующей иностранной валюте, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа.

Оплата первоначального взноса в размере 30 % от цены договора осуществляется в течение 7 календарных дней с даты регистрации договора в Мингорисполкоме. Остальные выплаты по договору осуществляются ежемесячно, в соответствии с графиком платежей, до декабря 2019 года включительно.

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве**

Принятие и регистрация заявлений потенциальных дольщиков о заключении договоров осуществляются отделом собственного строительства ОАО «Минский домостроительный комбинат» через 5 календарных дней после опубликования проектной декларации, с 26 февраля 2019 года, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43 (отдел собственного строительства — 3-й этаж) понедельник — четверг — 8.15 — 16.30, обед — 12.00 — 12.45, пятница — 8.15 — 15.00, обед — 12.00 — 12.45. Заключение договоров создания объекта долевого строительства, через 7 календарных дней после опубликования проектной декларации.

Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ОАО «Минский домостроительный комбинат» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

Данная проектная декларация отменяет действие предыдущих проектных деклараций, опубликованных в газете «Звязда» от 14.07.2018 г. № 133, № 189 от 02.10.2018 г.

## Уважаемые акционеры открытого акционерного общества «Дорожно-строительного треста № 1, г. Витебск».

26 марта 2019 года в 14.30 состоится годовое общее собрание акционеров открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск».

Собрание пройдет по адресу Общества: г. Витебск, ул. Суворова,16, актовый зал.

**Повестка дня собрания:**

**1.** О деятельности Общества за отчетный период и основных направлениях деятельности Общества на 2019 год.

**2.** Отчет о работе наблюдательного совета в 2018 году.

**3.** Утверждение аудиторского заключения по итогам 2018 года.

**4.** Утверждение заключения ревизионной комиссии по результатам проверки Общества за 2018 год.

**5.** Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2018 год.

**6.** О распределении прибыли и убытков Общества за 2018 год. О выплате дивидендов за 2018 год.

**7.** О распределении прибыли и убытков Общества на 2019 год. О выплате дивидендов в 2019 году.

**8.** Избрание членов наблюдательного совета Общества.

**9.** Избрание членов ревизионной комиссии Общества.

**10.** Определение размера вознаграждений и компенсации расходов членам наблюдательного совета, ревизионной комиссии Общества.

**11.** О внесении изменений и дополнений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться у председателя наблюдательного совета по адресу: г. Витебск, ул. Суворова, 16, с 5 марта по 25 марта 2019 г. (время работы с 8.30 до 17.30) либо 26 марта 2019 г. по месту проведения собрания, контактный телефон (8-0212) 67-45-66.

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг и список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров 4 марта 2019 года.

Регистрация участников собрания — с 13.45 до 14.15 по месту проведения собрания. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет
УНП 300000398

**Отчет за 2018 год по использованию Благотворительным Фондом помощи детям «Белый Аист» своего имущества**

| № | Наименование сведений | Количество/ден. сумма (бел. руб.) | Примечание |
|---|---|---|---|
| 1 | Информация о количестве учредителей фонда | один | Усманов С.В. |
| 2 | Имущество, переданное учредителем фонда, а именно деньги | нет | |
| 3 | Поступления от проводимых в соответствии с уставом фонда мероприятий, а именно: | нет | |
| 4 | Доходы, полученные от осуществляемой в соответствии с уставом фонда предпринимательской деятельности | нет | |
| 5 | Иные не запрещенные законодательством Республики Беларусь поступления, а именно: пожертвования физических лиц, безвозмездная (спонсорская) помощь юридических лиц | 48436,21 | |
| 6 | Информация об общей сумме расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в уставе | 48604,19 | |
| 7 | Информация о количестве унитарных предприятий, хозяйственных обществ, созданных фондом для осуществления предпринимательской деятельности, в том числе об участии фонда в таких юридических лицах | нет | |

УНП 194902950

## ООО «Правовая компания «Антикризисный консалтинг АСС ВУ»

### извещает о проведении повторных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ликвидируемому закрытому акционерному обществу «Евробанк».

**Продавец** – ЗАО «Евробанк».

**Организатор торгов** — ООО «Правовая компания «Антикризисный консалтинг АСС ВУ».

Сведения об имуществе, выставляемом на повторные торги и находящемся по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 129/5.

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС | Шаг торгов (5 %), бел. руб. | Сумма задатка (10 %), бел. руб. | Преимущества |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | Капитальное строение с инв. № 500/С-35055, общая площадь 1432 кв. м, 4 этажа, расположенное на земельном участке площадью 0,1235 га с кад. ном. 500000000007006447, который находится на праве аренды по 31.01.2023 г. | 3 093 876,00 | 154 693,80 | 309 387,60 | - пригодно для размещения банков и финансовых организаций;<br>- установлены дополнительные системы защиты от взлома;<br>- внутренняя и внешняя отделка здания;<br>- имеются все инженерные коммуникации;<br>- система кондиционирования;<br>- оборудованы офисные помещения;<br>- расположено в торговом комплексе «Ждановичи»;<br>- отличное транспортное сообщение (вблизи ж/д, общественный транспорт, автомагистрали);<br>- 630 м от МКАД;<br>- охраняемая территория с видеонаблюдением;<br>- парковочные места на территории |
| Лот № 2 | Транспортное средство Hyundai Grandeur, серебристый металлик, гос. ном. 8584 IX-7, 2008 г. в., автоматическая КПП, объем двигателя 3342 см$^3$, кузов номер KMHFC41DP9A346794 | 12 420,00 | 621,00 | 1 242,00 | - антиблокировочная система;<br>- бортовой компьютер;<br>- подушка безопасности;<br>- тахометр оборотов ДВС;<br>- система курсовой устойчивости;<br>- противотуманные фары;<br>- климат-контроль;<br>- круиз-контроль;<br>- салон – натур. кожа;<br>- парктроник;<br>- автомагнитола;<br>- зеркала эл. с обогревателем;<br>- подогрев сиденья |

Повторные торги по продаже Лота № 1 (капитальное строение с инв. № 500/С-35055) состоятся **22 марта 2019 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, д. 6/2, оф. 2304.

Повторные торги по продаже Лота № 2 (Транспортное средство Hyundai Grandeur) состоятся **4 марта 2019 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, д. 6/2, оф. 2304.

Для участия в повторных торгах:

- по Лоту № 1 в период с 21 февраля 2019 года по 20 марта 2019 года (до 18.00),

- по Лоту № 1 в период с 21 февраля 2019 года по 1 марта 2019 года (до 18.00),

необходимо подать заявку и перечислить на расчетный счет ООО «Правовая компания «Антикризисный консалтинг АСС ВУ» р/с BY95GTBN30 12800000189536901 в ОАО «Франсабанк», код GTBNBY22 , г. Минск, пр-т Независимости 95а, УНП 191027557, сумму задатка в размере 10 % от начальной цены имущества. Сумма шага аукциона по каждому лоту составляет 5 % от начальной цены предмета аукциона.

**Подробную информацию о реализуемом имуществе ЗАО «Евробанк», включая фотографии, можно получить на сайте: www.acc.by (Раздел новости).**

Также с имуществом, выставляемым на повторные торги, можно ознакомиться по месту его нахождения, предварительно согласовав время по тел. +37529 141 01 01 (ликвидатор ЗАО «Евробанк» Хвостович Сергей Валерьевич).

Повторные торги проводятся в соответствии с Постановлением Советом Министров от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица».

Прием заявок на участие в повторных торгах с документами, подтверждающими внесение задатка, осуществляет организатор торгов – **ООО «Правовая компания «Антикризисный консалтинг АСС ВУ»** – ежедневно по рабочим дням с 9.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, д. 6/2, оф. 2304, а также по факсу: 8-017-204-50-03, по почте: 220079, г. Минск, а/я 267 и электронной почте: director@acc.by.

Победителем торгов является лицо, предложившее наибольшую цену.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам.

В случае если торги признаны несостоявшимися, в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

По результатам аукциона организатор торгов составляет протокол в трех экземплярах.

Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней с даты проведения торгов.

Срок оплаты предмета торгов **—** 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не менее чем за 3 дня до даты проведения торгов.

С более подробной информацией о порядке, условиях проведения торгов, предметах торгов можно ознакомиться по тел.: +37529 308 38 37.

## ОАО «АМКОДОР» — управляющая компания холдинга», 220013, г. Минск, ул. П. Бровки, 8, комн. 201.

Извещение о проведении очередного (годового) общего собрания акционеров общества

Собрание состоится 27 марта 2019 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. П. Бровки, 8, актовый зал общества.

Орган, созывающий собрание акционеров, — Совет директоров ОАО «АМКОДОР» — управляющая компания холдинга».

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 13.30 до 14.45.

Регистрация лиц, имеющих право на участии в собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия. При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (договором) (руководители юридических лиц — акционеров — документом, подтверждающим статус руководителя).

**Повестка дня:**

1. Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2018 год. Утверждение ключевых показателей эффективности на 2019 год.

2. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2018 год.

3. Утверждение распределения и использования прибыли (убытков) за 2018 год.

4. Утверждение направлений распределения прибыли на 2019 год.

5. Избрание членов Совета директоров и Ревизионной комиссии общества.

6. Утверждение размера вознаграждения членам Совета директоров и Ревизионной комиссии общества.

Лица, имеющие право на участие в собрании, имеют право ознакомиться с информацией о деятельности общества за отчетный период, начиная с 7 марта 2019 года, а с иной информацией (документами), подлежащими представлению при подготовке к проведению собрания, начиная с 22 марта 2019 года ежедневно (кроме субботы и воскресенья) в юридическом управлении ОАО «АМКОДОР» — управляющая компания холдинга» (220013, г. Минск, ул. П. Бровки, 8) с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Совет директоров ОАО «АМКОДОР» — управляющая компания холдинга».

УНП 100135676

Утерянный представительством Белгосстраха по Фрунзенскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 2294144 **считать недействительным.** УНП 100122726

## И З В Е Щ Е Н И Е о проведении повторного открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «МогилевАттракционы» 4 марта 2019 года

| № лота | Предмет аукциона (наименование объекта, его местонахождение, площадь) | Начальная цена продажи предмета аукциона, бел. руб., к. (с учетом НДС) | Размер задатка, бел. руб., к. | Характеристика объекта | Условие аукциона |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инвентарным номером 700/D-81189, общей площадью 108,4 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Якубовского, 55 | 146 880,00 | 7 344,00 | Помещение расположено на 1-м этаже 5-этажного жилого дома 1968 г. постройки. Стены – крупнопанельные, перегородки – гипсолитовые; перекрытия – железобетонные; полы – плиточные, бетонные; проемы оконные – двойные, витражи, дверные – простые. Имеются центральное отопление, электроснабжение, водопровод, канализация, телефон | В течение 3 банковских дней после заключения договора купли-продажи объекта недвижимого имущества покупатель должен дополнительно оплатить продавцу затраты, понесенные за установку и обслуживание пожарной сигнализации в размере 2 473,12 (Две тысячи четыреста семьдесят три белорусских рубля 12 копеек) |

**Начальная цена снижена на 20 %.**

**Повторный аукцион состоится 4 марта 2019 года в 15.00 в каб. 410 здания Могилевского городского исполнительного комитета по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.**

Заявки принимаются ежедневно с 21 февраля 2019 г. в рабочие дни с 8 до 17 часов (обеденный перерыв — с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.

**Последний день приема заявлений и внесения задатка – 1 марта 2019 года до 13.00**.

Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.

Заключительная регистрация участников аукциона — **4 марта 2019 года** с 14.00 до 15.00.

Продавец: ОАО «МогилевАттракционы», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 16-90, тел.: (0222) 77-26-67, 30-64-40, 8-029-601-76-22.

Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, контактные телефоны — 42-25-64, 42-24-59, 8-029-15-15-444.

Аукцион проводится в соответствии с порядком проведения открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «МогилевАттракционы».

Лица, желающие принять участие в аукционе, не позднее срока, указанного в извещении о проведении аукциона подают заявление на участие в аукционе, подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон, заявление об ознакомлении с объектом, к которым прилагаются:

- **документ, подтверждающий внесение суммы задатка** на расчетный банковский счет организатора аукциона, — МГ УКП «Центр по приватизации» BY66BLBB30120700008710001001 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, код BLBBBY2X, УНН 700008710 с отметкой банка;
- **юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;
- **иностранным юридическим лицом —** легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
- **иностранным индивидуальным предпринимателем** – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
- **представителем юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная в установленным законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);
- **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь –** нотариально удостоверенная доверенность;
- **представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя –** доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона, обязан в установленном порядке возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

Договор купли-продажи заключается продавцом и победителем аукциона (единственным участником аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.

Условия и порядок оплаты – оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета аукциона производится в размере 60 % в течение 3 банковских дней с момента заключения договора купли-продажи предмета аукциона, оставшаяся сумма в размере 40 % в течение 10 банковских дней с момента заключения договора купли-продажи.

С объектом можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8 до 17 часов, предварительно согласовав время с продавцом.

В предусмотренных законодательством случаях уплачивается штраф организатору аукциона в течение одного месяца в размере 100 базовых величин: **победителем аукциона** — в случае, если он в установленный срок не подписал протокол о результатах аукциона, не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона, не подписал договор купли-продажи предмета аукциона; **лицом, приравненным к победителю аукциона** — в случае его отказа (уклонения) от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и (или) подписания договора купли-продажи предмета аукциона; **участниками аукциона** – в случае их отказа объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным.

Полная информация о выставленном на аукцион объекте недвижимости опубликована в газете «Звязда» № 225 (28841) от 22 ноября 2018 г.

**Контактные телефоны организатора аукциона для уточнения и получения дополнительной информации: (0222) 42-25-64, 42-24-59, 8-029-15-15-444.**

## Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

УНП 100693551

сообщает, что 26 марта 2019 года в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк» от 13 февраля 2019 года, протокол № 2, проводится годовое Общее собрание акционеров в очной форме.

Место нахождения общества и место проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

### Повестка дня

**1.** О работе Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк» в 2018 году.

**2.** Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Белагропромбанк» за 2018 год и задачах на 2019 год.

**3.** О заключении Ревизионной комиссии ОАО «Белагропромбанк» по результатам проведения ежегодной ревизии финансовой и хозяйственной деятельности ОАО «Белагропромбанк» за 2018 год.

**4.** Об утверждении годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Белагропромбанк» за 2018 год.

**5.** О распределении прибыли банка за 2018 год и направлениях использования прибыли в 2019 году.

**6.** О выборах нового состава Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк».

**7.** О выборах нового состава Ревизионной комиссии ОАО «Белагропромбанк».

Время начала проведения собрания — 15.00.

Список лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного по состоянию на 13 февраля 2019 года.

Лица, имеющие право на участие в Общем собрании, могут знакомиться с перечнем информации (документов) при подготовке к проведению собрания по адресу: г. Минск, пр-т Жукова, 3, следующим образом:

при регистрации лиц, имеющих право на участие в собрании, им предоставляются для ознакомления следующие документы:

информация о деятельности ОАО «Белагропромбанк» за 2018 год согласно требованиям законодательства Республики Беларусь, с которой возможно ознакомиться не менее чем за двадцать дней до проведения собрания;

информационный бюллетень о показателях работы банка за 2018 год;

годовая индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Белагропромбанк» за 2018 год в составе: бухгалтерский баланс; отчет о прибылях и убытках; отчет об изменении собственного капитала; отчет о движении денежных средств;

аудиторское заключение по результатам проведения аудита годовой индивидуальной бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2018 год;

заключение Ревизионной комиссии ОАО «Белагропромбанк» по результатам проведения ежегодной ревизии финансовой и хозяйственной деятельности ОАО «Белагропромбанк» за 2018 год;

проекты решений годового Общего собрания акционеров ОАО «Белагропромбанк»;

отчет о результатах самооценки эффективности деятельности Наблюдательного совета, членов Наблюдательного совета, внутренней оценки эффективности деятельности Правления;

сведения о кандидатах, выдвигаемых в Наблюдательный совет и Ревизионную комиссию ОАО «Белагропромбанк».

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, будет проводиться по месту проведения собрания 26 марта 2019 г. с 13.00 до 14.45 при предъявлении документов, подтверждающих их полномочия.

Телефоны для справок: 8(017) 229 64 10 или 229 64 59.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 13 января 2017 года выдана Национальным банком Республики Беларусь.

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Узденского райпо (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:

**Лот 1: (повторный аукцион): здание магазина с инв. № 623/С-58710 общей площадью 113 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625680213201000206 площадью 0,0963 га по адресу: Минская область, Узденский район, Дещенский с/с, д. Теплень, ул. Октябрьская, 45.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 14 012,64 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **1 401,00 бел. руб.**). **Стоимость снижена на 20 %;**

**Лот 2: (повторный аукцион): здание магазина с инв. № 623/С-58709 общей площадью 82,7 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625680213501000066 площадью 0,0636 га по адресу: Минская область, Узденский район, Дещенский с/с, д. Тристенец, ул. Тристенецкая, 30.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 9 002,65 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **900,00 бел. руб.**). **Стоимость снижена на 20 %**;

**Лот 3: (повторный аукцион): здание магазина с инв. № 623/С-58711 общей площадью 104,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625683207701000065 площадью 0,0834 га по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, д. Румок, ул. Победы, 1.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 12 753,75 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **1 275,00 бел. руб.**). **Стоимость снижена на 20 %**;

**Лот 4: (повторный аукцион): здание склада с навесом по железобетонным столбам с инв. № 620/С-38757 общей площадью 512,4 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622282800003000019 площадью 0,0848 га по адресу: Минская область, Дзержинский район, Негорельский с/с, район аг. Негорелое.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 51 150,60 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **5 115,00 бел. руб.**). **Стоимость снижена на 9,5 %**;

**Лот 5: (повторный аукцион): здание магазина с инв. № 623/С-58747 общей площадью 93,6 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625683208701000081 площадью 0,0767 га по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, д. Хоромицкие, ул. Центральная, 19.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 10 266,72 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **1 026,00 бел. руб.**). **Стоимость снижена на 20 %**;

**Лот 6: (повторный аукцион): здание магазина с инв. № 623/С-58809 общей площадью 87,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625683205101000027 площадью 0,0771 га по адресу: Минская область, Узденский район, Слободской с/с, д. Каменое.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 3 184,70 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **318,00 бел. руб.**). **Стоимость снижена на 76 %**;

**Лот 7: здание склада с инв. № 623/С-38431 общей площадью 588,8 кв. м и здание склада с инв. № 623/С-58840 общей площадью 195,1 кв. м. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 625650100005000471 площадью 2,0325 га по адресу: Минская область, г. Узда, пер. Колхозный, 5А, 5А/1.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 94 710,50 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **9 471,00 бел. руб.**).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330 000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в следующем размере: по лотам №№ 1, 3 – 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лотам №№ 2, 5, 6 — 10 (десяти) процентов, по лоту № 4 – 4 (четыре) процента, по лоту № 7 – 3 (три) процента. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион по продаже лотов №№ 1—6 состоится **14.03.2019 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.03.2019 до 16.00** по указанному адресу. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 15.12.2018 (по лотам №№ 1, 2, 3, 4), от 22.12.2018 (по лоту № 5), от 02.10.2018 (по лоту № 6).

Аукцион по продаже лота № 7 состоится **27.03.2019 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.03.2019 до 16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ОБУВЬТОРГ»

**20 марта 2019 года** в кабинете директора по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 28 состоится **ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**!

**Начало собрания – 14.00.**

Регистрация участников проводится с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

- акционеру Общества – паспорт;
- представителю акционера – паспорт и доверенность.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

**1.** Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2018 год и перспективах развития Общества на 2019 год.

**2.** О работе наблюдательного совета ОАО «Обувьторг» в 2018 году.

**3.** Отчет ревизионной комиссии о результатах аудиторской проверки Общества за 2018 год.

**4.** Об утверждении годового отчета и дополнения к положению об учетной политике в целях бухгалтерского и налогового учета на 2019 год, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Обувьторг» за 2018 год.

**5.** Об утверждении распределения чистой прибыли за 2018 год.

**6.** О выплате дивидендов за 2018 год.

**7.** О направлениях использования чистой прибыли Общества в 2019 году и 1 квартале 2020 года.

**8.** О внесении изменений в Устав Общества.

**9.** Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Обувьторг».

**10.** О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни, начиная с 13 марта 2019 года по месту нахождения Общества.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра на 20 февраля 2019 года.

УНП 100262652 Наблюдательный совет.

## Акционерам ОАО «Белбуд»

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении очередного Общего собрания акционеров ОАО «Белбуд»

Уважаемые акционеры!

Открытое акционерное общество «Белбуд», расположенное по адресу: 220113, г. Минск, ул. Восточная, 133, офис 1, сообщает о проведении очередного Общего собрания акционеров в очной форме.

**Собрание состоится 21.03.2019 в 15.00** по адресу: 220113, г. Минск, ул. Восточная, 133, офис 1, конференц-зал.

Регистрация участников производится по месту проведения собрания 21.03.2019 с 14.30 до 14.50 на основании списка лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров.

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

**1.** Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2018 году и основных направлениях развития Общества на 2019 год.

**2.** Утверждение заключений аудиторской и ревизорской проверок финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2018 год.

**3.** Утверждение годового бухгалтерского баланса и отчета о прибыли и убытках Общества за 2018 год.

**4.** Утверждение источников покрытия убытков за 2018 год и утверждение использования прибыли на 2019 год.

**5.** Определение рекомендуемого размера вознаграждения и компенсаций расходов членам Наблюдательного Совета и Ревизионной комиссии за исполнение ими своих обязанностей.

**6.** Избрание членов Наблюдательного Совета и Ревизионной комиссии.

Для регистрации необходимо иметь при себе: паспорт, представителю акционера — доверенность и паспорт.

Лица, имеющие право на участие в общем собрании акционеров, могут ознакомиться с документами, подготовленными к собранию, с 11.03.2019 (понедельник — четверг — с 8.30 до 17.00, пятница — с 8.30 до 16.00, обед с 13.00 до 13.20) по адресу: г. Минск, ул. Восточная, 133, офис № 1 (в приемной генерального директора), а в день проведения Собрания — по месту его проведения.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет составлен по состоянию на 18.03.2019.

Телефон для справок – 8017 237 29 50.

УНП 100794022

## ОАО «Амкодор-КЭЗ»

УНП 300028841

Витебская обл., Толочинский район, г. п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3.

Извещение о проведении очередного (годового) общего собрания акционеров общества.

Собрание состоится 29 марта 2019 г. в 14.00 по адресу: Витебская обл., Толочинский район, г.п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3, зал заседаний Общества.

Орган, созывающий собрание: Совет директоров ОАО «Амкодор-КЭЗ».

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 13.00 до 13.55.

Регистрация лиц, имеющих право на участии в собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия. При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (договором) (руководители юридических лиц — акционеров — документом, подтверждающим статус руководителя).

**Повестка дня:**

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества за 2018 год. Утверждение ключевых показателей эффективности на 2019 год.

2. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2018 год.

3. Утверждение распределения и использования прибыли (убытков) за 2018 год.

4. Утверждение направлений распределения прибыли на 2019 год.

5. Избрание членов Совета директоров и Ревизионной комиссии общества.

6. Утверждение размера вознаграждения членам Совета директоров и Ревизионной комиссии общества.

Лица, имеющие право на участие в собрании, имеют право ознакомиться с информацией о деятельности общества за отчетный период, начиная с 7 марта 2019 года, а с иной информацией (документами), подлежащими представлению при подготовке к проведению собрания, начиная с 22 марта 2019 года ежедневно (кроме субботы и воскресенья) в отделе кадров ОАО «Амкодор-КЭЗ» (Витебская обл., Толочинский район, г. п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3) с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Совет директоров ОАО «Амкодор-КЭЗ»

Информация о формировании реестра акционеров

ОАО «Амкодор-КЭЗ», Витебская обл., Толочинский район, г. п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3, на основании решения Совета директоров общества от 14 февраля 2019 года для проведения очередного (годового) общего собрания акционеров определило дату формирования реестра акционеров — 1 марта 2019 года.

## Ежегодный отчет об использовании своего имущества

Местный фонд поддержки науки, образования и предпринимательства «НОВЫЙ ПОЛОЦК» (далее – фонд) зарегистрирован решением Главного управления юстиции Витебского облисполкома от 21.12.2017 № 46. Свидетельство о государственной регистрации № 02-0008. Учетный номер плательщика 390541407.

Учредителями фонда являются физические лица в составе 3 человек.

Стоимость имущества, переданного учредителями и поступившего от проводимых в соответствии с уставом фонда мероприятий от иных физических лиц и юридических лиц в виде безвозмездной спонсорской помощи, в 2018 году составила 13 910,34 белорусского рубля.

Общая сумма расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в его уставе, за 2018 год составила 7269,06 белорусского рубля.

В 2018 году предпринимательская деятельность фондом не осуществлялась, унитарные предприятия либо хозяйственные общества для осуществления предпринимательской деятельности фондом не создавались и участие в таких юридических лицах фонд не принимал.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
21 02 2019 г.

SEX-БАЛЯСЫ

# НАПЕРАД У МІНУЛАЕ?

**Я ўжо неяк згадваў, што зараз у трэндзе — мода 1990-х гадоў. Розныя модныя дамы, дызайнеры ўсімі сіламі рэкламуюць тое, што некалі насілі бацькі цяперашніх тынэйджараў. Памятаеце, я расказваў пра «татаў стыль»: пра красоўкі і расцягнутыя світары? («13-гадовая Каця, прыйшоўшы дадому і ўбачыўшы маці ў сваёй школьнай форме, зразумела, што сёння яна будзе начаваць у бабулі».) І вось жа што дзіўна! Раней мы імкнуліся зазірнуць у будучыню, уяўляючы яе на свой капыл, марачы пра «прыгожае далёка». А цяпер, выходзіць, нас цягне назад, у мінулае? Выпадковасць? Не думаю, як любіць паўтараць адна вядомая тэлеперсона.**

За ўсім гэтым стаяць найперш разлік і грошы. Новыя трэнды — гэта не больш, чым, напрыклад, вяртанне туфляў з круглым ці квадратным носам праз колькі гадоў. («Усе маркетолагі і мерчандайзеры свету бяссільныя супраць мужыка са спісам пакупак».) Напрыклад, купальнікі ў стылі 1990-х з высока выразанымі трусікамі — апошні трэнд пляжнай моды. Раней лічылася, што насіць іх могуць толькі дзяўчаты з бездакорнымі фігурамі. А што, не так? Не, спрабуюць даказаць мне! Нядаўна 90-кілаграмовая амерыканская мадэль Эшлі Грэм знялася на пляжы ў малюсенькім бікіні. Нягледзячы на цэлюліт... («Усё, што я ведаю пра Вольгу Бузаву і Анастасію Валачкову, я даведаўся супраць сваёй волі».) Зрэшты, улічваючы, што па версіі Forbes, амерыканка ўваходзіць у дзясятку самых багатых манекеншчыц, чаго саромецца — за такія мільёны...

Так, я гатовы да хрыпаты даказваць, што самы сапраўдны смак не ў цяперашніх прадуктаў, а ў ранейшых — напітках «Байкал» і «Тархун», «Кішынёўскім» хлебе і балгарскім кетчупе, трубачках з заварным крэмам за 22 капейкі. Так, тады і цукар быў саладзейшы і батон смачнейшы! («У дзяцінстве мы хварэлі радзей, чым нашы дзеці. Вось думаю... Што было лячэбным? Смала... Гудрон... Кветкі акацыі... Зялёныя «драўляныя» ранеткі... Ці кіслыя попкі мурашоў?..») Адносна прадуктаў — гэта абсалютная праўда, хоць тут ёсць і больш важны момант. Гаворка ідзе пра наша дзяцінства... Пра гульні. («У дзяцінстве на перапынках мы кідаліся мокрымі анучамі. Упэўнены, цяпер для гэтага ёсць спецыяльная праграма для айфона».) Пра першыя пачуцці. («Калі я сёння прачытаў статус «Малады сексуальны хлопец 14 гадоў шукае непрадказальную палкую дзяўчыну 14—15 гадоў для сур'ёзных адносін», то зразумеў, што мне ўжо ў прынцыпе пазняк мітусіцца. Адбегаў, як той казаў, дзядуля».) Пра самастойнасць. («— Мама, я іду дадому. Што-небудзь купіць трэба? — Кватэру сабе, сынок, нарэшце купі і жыві асобна ад нас!») Канешне, не ўсё тады было такім вясёлкавым, прынамсі, як нам самім уяўлялася. («Можа, ноч менавіта таму і стала сівой, што Юра Шатуноў давяраў ёй свае тайны?») Памятаеце выступленне колішняга ўдзельніка КВЗ, а цяпер вядомага стэндапера Івана Абрамава? «Мы ж менавіта таму ніколі не любілі з бацькамі хадзіць па пакупкі, бо прыгадайце: мы ішлі на рынак з жаданнем купіць сабе крутую касуху з балахонам, а табе куплялі якасны пухавік, які, самае галоўнае, попу прыкрывае і твае перспектывы з дзяўчатамі на наступныя дзесяць гадоў, таму што бралі на выраст, а ты так і не вырас».

Вы хочаце, каб апошняе вярнулася? Вось і я не. А нам гэта навязваюць, прыкрываючыся настальгіяй. Таму яшчэ больш здзіўлены тым, што на змену модзе на 1990-я гады прыходзіць чарговы трэнд — на... 1980-я! Іх яшчэ называюць «яркімі». Не ведаю, чаму. («У СССР сексу не было. Ну, у мяне дакладна не было».) Адзін дэфіцыт чаго варты. («Дарэчы, памятаю тыя часы, калі адзінай цацкай, якую можна было знайсці ў ежы, была пластмасавая лічба ў кавалку сыру».) А цяпер візажысты, стылісты, майстры па прычосках, фатографы рэкламуюць кожны сваю «дзялянку», маўляў, будзь модны. («Бабуля з унучкай два тыдні гулялі «ў школу». І толькі напрыканцы другога тыдня бабуля даведалася, што робіць за яе дамашнія заданні».) Таму мой адказ — ха-ха. («Хто касету перамотваў алоўкам, той спінер не купляе».)

Яшчэ адзін чарговы «развод», заснаваны на настальгіі, — флэшмоб «Я 10 гадоў таму», які пракаціўся па ўсім свеце, у тым ліку і ў нас. Па яго ўмовах трэба было ў сеціве выкласці дзве фатаграфіі — цяперашняга дня і дзесяцігадовай даўніны. Вось, маўляў, які я быў і які стаў. («Перыядычна фоткаю вынік свайго пахудзення. Пакуль што ўсё «да».) Амаль адразу пасля запуску флэшмоба пачалі гаварыць, што гэта цудоўны спосаб абнавіць звесткі пра карыстальнікаў, якімі могуць скарыстацца і кіберзлачынцы ў тым ліку. («— Любы, перад нашым вяселлем я хацела б ва ўсім пакаяцца... — Але ж ты ўсё мне ўжо расказала?! — Ну, ведаеш... З'явілася свежая інфармацыя...»)

...«Мінулае не вернецца, і не дапаможа сляза» — па-ранейшаму спявае вечна малады (?!) Аляксандр Саладуха, адначасова (?!) нагадваючы пра настальгію па мінулым і абвяргаючы магчымасць вяртання ў яго. Ці хацеў бы я патрапіць у ранейшыя часы? Насамрэч пытанне не такое і простае. Але, мабыць, усё ж не... Хіба толькі, каб была машына часу, скокнуў бы ў мінулае на непрацяглы час. Каб убачыць маладых бацькоў, каб яшчэ раз адчуць яго — смак сапраўднага дзяцінства...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «На лёдзе даю волю эмоцыям»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

***— Бацькі заўсёды падтрымліваюць вас на спаборніцтвах?***

— На турніры ў іншыя гарады не выязджаюць, але на мясцовых заўсёды прысутнічаюць. Мы пра гэта ніколі не дамаўляемся, таму што за дзень да спаборніцтваў не размаўляем, але я заўсёды ведаю, што ўбачу іх на трыбунах.

***— Не размаўляць напярэдадні выступлення — звычай?***

— Мне так лягчэй сабрацца і настроіцца на старт, яны гэта ведаюць. За дзень да спаборніцтва не кантактую ні з кім, апроч трэнера, а ў дзень пракату толькі трэніруюся, сплю і слухаю музыку.

***выхавала алімпійскіх чэмпіёнак Юлію Ліпніцкую і Аліну Загітаву. Якія галоўныя ўрокі атрымалі ад яе?***

— Канкрэтна ў Этэры Георгіеўны я займаўся два гады, і ў мяне засталіся выключна станоўчыя ўражанні. Да гэтага часу падтрымліваем кантакты. Яна навучыла мяне працаваць. Там ніхто цябе не прымушае, але калі ты выходзіш на лёд, дакладна ведаеш, што будзеш рабіць.

***— Цяпер многія яе вучні кажуць пра складаны і цвёрды характар настаўніка...***

— Усё роўна, які ён, галоўнае, што яна ведае, як дасягнуць выдатнага выніку.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

***— Якую ролю адыгралі бацькі ў вашым станаўленні ў спорце...***

— Вельмі вялікую, хоць самі не былі прафесійнымі спартсменамі. Тата ў дзяцінстве гуляў у футбол, мама — кандыдат у майстры спорту па спартыўнай гімнастыцы. Не дзіўна, што і я выбраў спорт. Калі быў маленькі, на пляцоўцы сталічнага Лядовага палаца ўбачыў, як катаецца дзяўчынка, мне вельмі спадабалася. Тата адвёў да гэтага ж трэнера, мы пазнаёміліся, і мяне ўзялі ў групу. Ужо дрэнна памятаю першага настаўніка, ведаю, што з той групы прафесійна займацца фігурным катаннем акрамя мяне засталася толькі адна дзяўчынка. Астатнія выбралі для свайго развіцця іншыя сферы.

***— Дзеля вашай кар'еры бацькі пераехалі з Мінска ў Маскву...***

— Так, гэта быў іх выбар. І мне, і ім там было вельмі цяжка, але мы гэта пераадолелі. Аднак пазней па сямейных абставінах вырашылі вярнуцца ў Мінск. Гэта ніяк не адбілася на маёй кар'еры, так атрымалася, што ў мяне якраз здарылася траўма. У Мінску я працягнуў трэніравацца ў Надзеі Пахамовіч, з якой працую і цяпер.

***— А ў Маскве трэніраваліся ў групе ў Этэры Тутберыдзэ, якая***

***— Наогул, наколькі істотна спартсмену быць з трэнерам на адной хвалі?***

— Гэта вельмі важна, напрыклад, мы з маім настаўнікам разумеем адно аднаго з паўслова. Скажам, хачу сёння паспрабаваць нейкі элемент, і яна ніколі не бывае супраць. У нас не здараецца канфліктаў ці рознагалоссяў, хоць у мяне дастаткова складаны характар.

***— У Беларусі фігурнае катанне не вельмі папулярны від спорту. Ніколі не было жадання пачаць развівацца ў іншай сферы?***

— Летась быў цяжкі аднаўленчы перыяд пасля аперацыі, у галаве раілася вельмі шмат розных думак, але каб кінуць спорт, да такога не даходзіла.

***— У дзяцінстве ў вас быў прыклад фігурыста, на якога хацелася б быць падобным?***

— Канкрэтнага куміра не было, але мне заўсёды падабалася, як катаецца іспанец Хаўер Фернандэс. Прыемна было сустрэцца з ім на мінскім лёдзе, прытым асабліва ў такі знамянальны для яго турнір — апошні ў кар'еры. Хаўер вельмі прыемны чалавек.

***— Вам у маладыя гады прыйшлося змагацца з сур'ёзнай траўмай. Гэта складана?***

— Так, выходзіць з сітуацыі значна цяжэй маральна, чым фізічна. Для мяне ў гэты час галоўным было зразумець, што нічога страшнага не здарылася, самому сабе тое даказаць. Я правёў тры месяцы без лёду, але вельмі рваўся катацца. Калі выйшаў на яго, трэба было ўнушыць сабе, што боязі няма, я павінен рабіць усё, як і раней. Было дастаткова цяжка перасіліць сябе.

**«Больш за ўсё я не люблю загадваць. Але, вядома, як і ўсе спартсмены мару пра Алімпіяду».**

***— Вы сказалі, што часта перад выступленнем слухаеце музыку. Што гучыць у навушніках часцей за ўсё?***

— Рок, прычым досыць цяжкі.

***— А катаецеся вы часта пад класіку. Спартсмену варта разбірацца ў розных жанрах музыкі?***

— Цяпер якраз усё часцей свет фігурнага катання сыходзіць ад класікі. На лёдзе ты быццам пераказваеш кнігу, таму, вядома, трэба разбірацца, разумець, пра што тая ці іншая музычная кампазіцыя, каб данесці сэнс да гледачоў і суддзяў.

***— Фігурнае катанне — гэта сумесь артыстызму і тэхнікі. Што даецца вам складаней?***

— Усё складана. Але на лёдзе я даю волю эмоцыям, таму з артыстычнасцю праблем няма. Дарэчы, у гэтым сэнсе я досыць розны, па-за межамі катка — дастаткова закрыты чалавек.

***— За дзве-тры хвіліны на лёдзе, падаецца, вы аддаяце вельмі шмат сіл, у тым ліку эмацыянальных. Як іх аднаўляеце?***

— Мяне падтрымліваюць сябры, пасля пракату вельмі хочацца размаўляць, дзяліцца эмоцыямі, і гэта мне дапамагае.

***— Што ў вашых глабальных мэтах?***

— Я не хацеў бы казаць пра свае канкрэтныя планы, усё ж такі варта жыць сённяшнім днём. Больш за ўсё я не люблю загадваць. Але, вядома, як і ўсе спартсмены, мару пра Алімпіяду.

***— Чым захапляецеся акрамя спорту?***

— Фігурнае катанне забірае асноўную частку часу, я заўсёды ва ўніверсітэце або на катку. Калі ёсць вольны час, вельмі люблю паглядзець баскетбол, у прыватнасці NBA, любімая каманда — «Лос-Анджэлес Лэйкерз».

***— Калі б не катанне, чым бы маглі займацца ў жыцці?***

— Я думаю, гэта сто працэнтаў быў бы спорт: альбо футбол, альбо баскетбол.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 20.02.2019 г.

Турызм

# NATIONAL GEOGRAPHIC ISRAEL НАЗВАЎ БЕЛАРУСЬ «КРАІНАЙ УРАЖАННЯЎ»

**На працягу пяці дзён эксперты і журналісты прэстыжнага выдання National Geographic Israel падарожнічалі па Беларусі. І нават за такі невялікі час наша краіна паспела ўразіць гасцей.**

Здавалася б, люты — не самы лепшы месяц для падарожжаў па Сінявокай. Але сумненні замежных журналістаў хутка развеяліся. Як прызналася **галоўны рэдактар National Geographic Israel Дафна Шломіт Раз,** для яе Беларусь — гэта краіна ўражанняў. Падчас прэстуру госці наведалі розныя музеі, аграсядзібы, паўдзельнічалі ў майстар-класах. Напрыклад, у Моталі яны навучыліся ўпрыгожваць каравай, даведаліся пра традыцыі беларусаў, адзяваліся ў народныя строі... І эксперты ўпэўнены, што этнаграфічны турызм трэба развіваць і рэкламаваць. На гасціннасці, эмоцыях можна падаваць зусім іншы прадукт. Тут трэба гаварыць не столькі пра турызм паміж краінамі, колькі пра турызм паміж людзьмі.

Адна з апошніх тэндэнцый у гэтай галіне — пошук лакальных адметнасцяў. Так, сёння падарожнікаў можна запрашаць наведаць не проста краіну, а нейкія асобныя яе рэгіёны. І чаму б не стварыць для кожнай вобласці Беларусі ўласныя прэзентацыі, прадумаць, як пераканаць замежнага госця, што кожны рэгіён заслугоўвае ўвагі? Такую думку выказаў **прафесар Ёэль Мансфельд з універсітэта Хайфы (Ізраіль),** эксперт па планаванні і даследаванні турызму. Ён ужо не першы раз наведвае Беларусь і вельмі ўражаны тымі зменамі ў турыстычнай галіне, якія адбыліся ў нас за апошнія дзесяць гадоў. І тым не менш прафесар бачыць адну з праблем, над якой у Беларусі яшчэ трэба папрацаваць, — адыход ад работы толькі з рускамоўнымі групамі. Госці з далёкага замежжа не змогуць вывучыць рускую ці беларускую мову, і гэта трэба ўлічваць. І вельмі добра, што ў Беларусі з'явіліся паказальнікі з перакладамі па-англійску. З тым, што яшчэ многа давядзецца зрабіць, каб перабудаваць інфраструктуру пад замежнага падарожніка, пагадзіўся і **дырэктар Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Андрэй МОЛЧАН.** На сёння мы яшчэ моцна залежым ад рынку Расіі, і кіраўніцтва санаторыяў і баз адпачынку не заўсёды спяшаецца нешта мяняць, калі ведае, што кліенты (а асноўныя спажыўцы тут — расіяне) усё роўна да іх прыедуць. Але задача па дыверсіфікацыі рынку паслуг ужо пастаўлена, і бязвізавы рэжым садзейнічае таму, што паступова ў нас павялічваецца колькасць гасцей з розных краін.

Дарэчы, адзін з кірункаў, які плануецца развіваць, — так званы настальгічны турызм. Многім выхадцам з Беларусі, чые сем'і сёння пражываюць у Ізраілі і іншых дзяржавах, было б цікава наведаць нашу краіну. Ёэль Мансфельд упэўнены, што тут не трэба ствараць асобныя маршруты для яўрэйскага насельніцтва, куды важней расказаць пра ўсе культуры, традыцыі, якія звязаны з пэўнай тэрыторыяй. Таксама, на яго думку, трэба рабіць больш сумесных тураў з іншымі краінамі, якія маглі б прываблівать турыстаў з суседніх дзяржаў.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Смачна есці!

## Мне — грачанікі з грыбамі. А на дэсерт — дзьмухаўцы

**XIX Тыдзень беларускай кухні пройдзе ў Мінску з 25 лютага да 3 сакавіка, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

У гэты перыяд у 60 рэстаранах і кавярнях сталіцы наведвальнікам прапануюць пяць страў нацыянальнай кухні. Прынцып гастранамічнага тыдня заўсёдны — адзіная рэцэптура і цана незалежна ад тыпу і класа аб'екта. Гэта робіцца для прыцягнення ўвагі гараджан і гасцей Мінска да страў беларускай кухні, прасоўвання і папулярызацыі нацыянальных кулінарных традыцый.

Сёлета гасцям прапануюць жур з мясам па цане 3,5 рубля, салату «Журавіны» за 6,5 рубля, фаршыраваную свініну па-беларуску з бульбянымі долькамі за 10,5 рубля, грачанікі з грыбамі за 8,5 рубля, дзьмухаўцы з мядова-журавінавай поліўкай за 4,5 рубля.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Вясна хутка

# СТРАВЫ З ПЕЧЫ, ПАРАННЕ Ў ЛАЗНІ

## і іншыя цікавінкі прапануюць у сакавіку будаўнічыя выстаўкі

**Драўляныя зрубы і альтанкі, ландшафтныя адметнасці і нечаканыя рашэнні ў інтэр'ерах і дызайне дамоў. Новыя матэрыялы для будаўніцтва і аздаблення, нечаканыя зоны для адпачынку і майстар-класы муляраў разам са стравамі з печы. Усё гэта чакае наведвальнікаў выставак «Беларускі дом» і «Драўлянае і каркаснае домабудаўніцтва. Лазня», якія адбудуцца ў канцы сакавіка ў Футбольным манежы.**

Спецыялізаваныя мерапрыемствы адкрыюць сёлетні будаўнічы сезон і, як абяцаюць арганізатары, будуць насычаны цікавымі акцыямі. Напрыклад, дзесяць майстроў з «Гільдыі печнікоў» на працягу трох выставачных дзён, з 28 да 30 сакавіка, пакажуць і падкажуць, як рабіць і эксплуатаваць печы. А яшчэ... пачастуюць стравамі з сапраўднай рускай печы на «гарачай дэгустацыі».

Наведвальнікі змогуць не толькі ўбачыць, «памацаць» і вывучыць навінкі ў сферы будаўніцтва, рамонту, архітэктуры, добраўпарадкавання і аздаблення, але і ўступіць у «Клуб будаўнічых кампаній Беларусі», а таксама паўдзельнічаць у народным чэмпіянаце па параннi. Можна будзе не толькі паспытаць парку проста на выстаўцы і даведацца пра асаблівасці будаўніцтва лазні, але і адчуць уласнай спінай прафесійны майстар-клас лазеншчыкаў.

**Ірына СІДАРОК.**

# Пластыкавая «вопратка» для прадуктаў

## НЕ ГАРЫЦЬ, НЕ ТОНЕ, НЕ ГНІЕ

Упакоўка і перапрацоўка пераследуюць абсалютна супрацьлеглыя мэты. Вытворца і пакупнік хочуць мець тару, якая ў агні не гарыць і ў вадзе не растваряецца, не ламаецца, не камечыцца, не раскладаецца, не гніе... Аднак установкі для апрацоўкі адходаў якраз разлічаны на тое, каб упакоўку можна было разбурыць, ушчыльніць, разабраць на складнікі. І хоць поўнасцю пазбавіцца ад выкарыстання пластыку немагчыма, неабходна скараціць яго колькасць, перастаўшы, напрыклад, прапаноўваць бясконцыя бясплатныя пакецікі. Так мяркуе **Ніна КУЛЬБЕДА, галоўны спецыяліст па інфармацыйнай рабоце дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў»,** аднаго з органаў, якія па даручэнні Прэзідэнта павінны распрацаваць прапановы аб паступовым замяшчэнні ПЭТ-бутэлек шкляной тарай:

— Мы не можам цалкам адмовіцца ад пластыкавай упакоўкі і замяніць яе, напрыклад, папяровай, якая поўнасцю раскладаецца за некалькі месяцаў. Каб вырабіць паперу, патрэбна прыродная сыравіна і шмат вады, а сам працэс вельмі энергазатратны. Калі паглядзець на ўвесь жыццёвы цыкл пластыкавай і папяровай тары ад стварэння і выкарыстання да моманту яе ўтылізацыі, то яшчэ невядома, хто «выйграе» па негатыўным уплыве на прыроду.

Пластык, дарэчы, адназначна лепшы па паказчыках вагі і трываласці. Пластыкавая ўпакоўка важыць у пяць разоў менш за папяровую. Адпаведна, менш затрат на яе перавозку і менш забруджвання паветра выкідамі транспарту.

Разам з тым ва ўпаковачнай індустрыі ўсё часцей задумваюцца над экалагічнымі рашэннямі. Напрыклад, як вырабляць тару з прадукцыі ад перапрацаваных другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР) або выкарыстоўваць упакоўку, якая цалкам магла б быць перапрацавана.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ЗАТРАТНАЯ ПЕРАПРАЦОЎКА

Шматслойная тара, або, як яе яшчэ называюць, упакоўка-торт, складаецца з некалькіх слаёў, аб'яднаных паміж сабой рознымі тэхналагічнымі спосабамі. Знешні слой звычайна выкарыстоўваецца для маляўнічага брэндзіравання, унутраныя — для захоўвання прыдатнасці прадукту і яго бяспекі. Іх немагчыма раздзяліць, а значыць — не выкарыстаць у якасці ДМР.

— Для другаснай перапрацоўкі неабходна атрымаць чысты матэрыял. Напрыклад, паперу без дамешкаў пластыку ці пластык без прымесяў металу або толькі дакладны тып пластыку. Аднак часцей за ўсё гэта немагчыма або настолькі тэхнічна складана і эканамічна затратна, што намаганні не апраўдаюцца, — кажа Ніна Кульбеда.

Нават тэтрапак, які многія лічаць кардонным і экалагічным, — насамрэч таксама ўпакоўка-торт, дзе можа быць і дзевяць слаёў паперы, поліэтылену, алюмінію. З такой тары таксама вельмі складана атрымаць чыстыя асобныя матэрыялы. Праўда, у арганізацыі спадзяюцца, што ўжо сёлета ў краіне з'явіцца аб'ект па перапрацоўцы камбінаванай упакоўкі «тэтрапак» для атрымання цэлюлозы, якая складае аснову такой тары.

## НА ПАЛІВА ЦІ НА ЗВАЛКУ

Гнуткая ўпакоўка — гэта тара для соусаў, кетчупаў, маянэзаў, кавы і іншых прадуктаў. У яе склад уваходзіць празрысты поліэтылен, клей, алюмініевая фольга і поліэтылентэрэфталат.

— Апошні сам па сабе вельмі каштоўны рэсурс, які лёгка перапрацаваць, аднак аддзяліць яго ад другіх частак без прымесяў немагчыма, — заўважае спецыяліст. — Таму перапрацоўваць такую кампазітную тару ў прамысловых маштабах можна толькі шляхам спальвання, каб атрымаць з гэтых адходаў цеплавую і электрычную энергію. За мяжой, дарэчы, больш за 60 працэнтаў пластыкавай упакоўкі або любой іншай лёгкай упакоўкі (не шкляной) ідзе якраз на паліва, у тым ліку і для цэментных заводаў.

Часткова шматслойную ўпакоўку выкарыстоўваюць для вытворчасці будаўнічых матэрыялаў і вулічнай мэблі. У Беларусі робяць невялікія партыі каналізацыйных люкаў і тратуарнай пліткі, але гэта толькі кропля ў моры, лічыць спецыяліст. Акрамя таго, гэта ўжо будзе апошняе жыццё прадукту. Калі ён сапсуецца, яго шлях толькі на звалку.

— Нават яркія хрусткія ўпакоўкі з-пад макароны, круп, пячэння і цукерак — гэта не проста поліэтылен. Тут прысутнічае чатыры віды пластыку: поліпрапілен, поліэтылен, полівінілхларыд, поліэтылентэрэфталат, раздзяліць якія таксама складана. Замест яркай упакоўкі можна набыць пячэнне ў паперы, а цукеркі — браць на вагу ці класці ў папяровы кулёк, — раіць Ніна Кульбеда.

Для некаторых відаў гнуткай упакоўкі ўсё ж можна падабраць альтэрнатыву. Для пакетаў з кавай гэта шклянкі, для кетчупу — ПЭТ-бутэлька, якая цудоўна перапрацоўваецца, або шкляная тара.

Тэтрапак ад малака — кардон+пластык+метал — таксама не перапрацоўваецца і раскладаецца сотні гадоў. Як і малочныя пакеты, якія маюць тры слаі, і пластыкавая непразрыстая тара для малака ў выглядзе збанка. Аднак усё гэта можна замяніць шклом або ПЭТ-бутэлькай. Праўда, тэрмін прыдатнасці напою паменшыцца.

## ЗНІШЧЫЦЬ НЕЛЬГА АДМОВІЦЦА

Каб папярэдзіць утварэнне адходаў, трэба паменшыць часта неапраўданы аб'ём упакоўкі і адмовіцца ад яе там, дзе гэта можна зрабіць без пагаршэння стану тавару, або ўніфікаваць тару, каб цалкам перапрацоўваць яе. Яшчэ адзін варыянт — пэўны від тавараў упакоўваць толькі ў канкрэтны матэрыял. Тады яго будзе лёгка адсартаваць з адходаў, каб атрымаць чыстую сыравіну, перапрацаваць і вярнуць у вытворчасць, дзеліцца Ніна Кульбеда:

— Пакуль заканадаўча такі падыход па папярэджанні ўтварэння адходаў і прыняцці мер, якія б паўплывалі на бізнес і абмежавалі яго ў выкарыстанні пэўных матэрыялаў, не ўдаецца замацаваць ні ў адной краіне. Усё гэта мае толькі рэкамендацыйны характар.

Думаючы пра неабходнасць змяншэння выкарыстання пластыку хоць бы там, дзе яго можна замяніць шклом, важна памятаць, што адмовіцца ад гэтага матэрыялу цалкам і забараніць яго ўсё роўна не атрымаецца, падкрэслівае Ніна Кульбеда:

— За мінулае стагоддзе колькасць насельніцтва вельмі ўзрасла, і пытанні забеспячэння харчавання людзей у свеце звязаны з упакоўкай ежы ў пластыкавую тару, выраблену па новых тэхналогіях, што спрашчае перавозку і захоўванне прадукцыі. Нават пры наяўнасці альтэрнатывы трэба ўзважыць, ці будзе магчымасць забяспечыць адпаведную колькасць такой тары і ці бяспечная вытворчасць упакоўкі-аналага.

Можна зменшыць выкарыстанне пластыку хоць бы там, дзе яго магчыма замяніць шклом. Аднак пры гэтым лепш вярнуцца да шкляной тары шматразовага выкарыстання, падкрэсліла спецыяліст.

**Ірына СІДАРОК.**

Разам з птушкамі

# Вялікі арлец — «асоба» года

**Ён — сапраўдны беларускі арол, велічная і рэдкая птушка — адзін з чатырох відаў арлоў, якія гняздуюцца ў нашай краіне. Як паведамляе грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны», арлец (вялікі падворлік) выбраны птушкай 2019 года.**

Вялікі арлец — балотны арол. Асноўныя месцы для палявання — нізінныя і пераходныя моцна абводненыя балоты, а таксама паўторна забалочаныя тарфянікі. Гняздуецца ў цяжкадаступных забалочаных лясах, часта на невялікіх лясістых выспах пасярод шырокіх балот.

У іх самкі буйнейшыя за самцоў, як і ў іншых драпежных птушак. Самцы важаць да 2 кілаграмаў, а самкі — да 3,2. Размах крылаў у самак дасягае 180 сантыметраў. Улюбёны ласунак — вадзяная палёўка, якая цяпер знікла або стала рэдкай у многіх месцах. Акрамя яе і іншых грызуноў, арлы ловяць таксама водна-балотных птушак, амфібій і рэптылій.

Крылатыя бацькі выводзяць аднаго «малога» на год. Не, кладка звычайна складаецца з двух яек, але з гнязда вылятае толькі адно птушаня. Улюбёныя месцы зімавання — у Грэцыі, Турцыі, Ізраілі, Егіпце, Эфіопіі і Судане.

У XX стагоддзі від знік з многіх краін, дзе раней гнездаваўся: Славакія, Венгрыя, Румынія, Балгарыя і Малдова. У нашай краіне вялікі арлец сустракаецца ў асноўным у Прыпяцкім Палессі, за межамі гэтага рэгіёна надзвычай рэдкі. Найбольшая групоўка жыве на Альманскіх балотах. Беларуская папуляцыя ацэньваецца ў 120—160 пар. Цяпер у нас на адных толькі Альманскіх балотах гняздуецца больш вялікіх арляцоў, чым ва ўсім Еўрасаюзе.

Для вялікага арляца, на жаль, існуе шмат пагроз: неспакой каля гнязда, змяншэнне плошчы адкрытых нізінных балот, асушальная меліярацыя, разворванне асушаных балот пад агракультуры, засваенне поймаў пад лецішчы і іншае будаўніцтва. А яшчэ адмоўна ўплывае на колькасць гэтых птушак браканьерскі адстрэл, амаладжэнне лясоў, высяканне гнездавых дрэў, драпежніцтва лясной куніцы і арлана-белахвоста. У выніку від уключаны ў Чырвоную кнігу Беларусі. Яго адносяць да відаў пад глабальнай пагрозай, захаванне якіх магчымае толькі праз нашы актыўныя дзеянні.

Каб захаваць гнездавыя тэрыторыі, спецыялісты АПБ арганізуюць экспедыцыі па пошуку гнёздаў вялікіх арляцоў, рыхтуюць дакументы, каб такія месцы былі ўзятыя пад ахову, робяць маніторынг папуляцыі.

У межах міжнароднага праекта «Навукова абгрунтаваная ахова глабальна пагражальнага віду вялікага арляца ў Беларусі» вядзецца назіранне анлайн за міграцыяй вялікіх арляцоў.

